ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЛІПЕНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 137 (27252) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Большасць учарашніх студэнтаў хутка перакваліфікуецца ў маладых спецыялістаў. Аднак не сакрэт, што да маладых кадраў на некаторых прадпрыемствах і ў арганізацыях ставяцца без асаблівага энтузіязму.**



**Ніколі яшчэ ўдзельнікі дзіцячага Еўрабачання не выклікалі столькі розных, часам супрацьлеглых меркаванняў, як адна з самых таямнічых фігур беларускай эстрады — Юрый Дземідовіч.**

**Першая беларуская праграма ўтылізацыі камерцыйнага транспарту прадугледжвае, што аўтамабіль кліента прымаюць на сэрвіс і прадастаўляюць кліенту кампенсацыю, а таксама — зніжку на набыццё новага аўтамабіля.** СТАР 2

*ЛІЧБА ДНЯ*

## 180 тысяч

***гледачоў наведалі 77 мерапрыемстваў XXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску-2012». Фестывальныя мерапрыемствы ў Летнім амфітэатры наведалі больш за 100 тыс. гледачоў. Найбольш яркімі сталі канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля народнага танца імя Ігара Маісеева, прысвечаны 75-годдзю ансамбля, юбілейная праграма Нацыянальнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга «Нам 25 гадоў! Усё пачынаецца спачатку» і бенефіс народнага артыста Расіі Льва Лешчанкі.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +24° |
| Віцебск | +19° |
| Гомель | +19° |
| Гродна | +20° |
| Магілёў | +17° |
| Мінск | +18° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.07.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8300,00 | ■ |
| Еўра | 10200,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 256,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1028,37 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ МАЮЦЬ НАМЕР РАЗВІВАЦЬ ПРАЕКТ САЮЗНАГА БУДАЎНІЦТВА

**Аб гэтым 18 ліпеня заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Мінску са старшынёй урада Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Мядзведзевым.**

Вітаючы Дзмітрыя Мядзведзева, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «ёсць аб чым пагаварыць, ёсць праблемы і пытанні стратэгічнага характару, якія трэба абмеркаваць».

«Вельмі важна, што вы пачынаеце сваё старое новае жыццё ў палітыцы з Беларусі, з правядзення вельмі важнага мерапрыемства (пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы). Гэта сведчыць аб тым, што інтэграцыйным працэсам мы ўдзялялі і будзем удзяляць увагу. І вось гэтаму ядру, нашаму галоўнаму праекту Саюзнай дзяржавы мы будзем удзяляць не толькі ўвагу, але і развіваць яго», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок гатовы да размовы па ўсіх пытаннях, у тым ліку саюзнага будаўніцтва, яго перспектыў, а таксама сферы абароны, фінансаў. «І з улікам тых неспрыяльных тэндэнцый, якія набліжаюцца да нас з вамі не то з Захаду, не то з Поўдня — з усіх канцоў. Ёсць мноства праблем, якія трэба было б і ўзгадніць», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу Дзмітрый Мядзведзеў канстатаваў, што беларуска-расійскія адносіны выйшлі на зусім іншы ўзровень стратэгічнага партнёрства.

«За апошні год, можа, крыху больш, мы прайшлі вельмі важны шлях і выйшлі на зусім іншы ўзровень стратэгічнага партнёрства, які не можа не радаваць нас у Расіі, і спадзяюся, у Беларусі такія ж настроі», — сказаў кіраўнік расійскага ўрада.

Паводле слоў Дзмітрыя Мядзведзева, аб актыўным супрацоўніцтве дзвюх краін сведчаць канкрэтныя лічбы: «Гандлёвы абарот паміж нашымі краінамі выйшаў на беспрэцэдэнтны ўзровень. Такога гандлёвага абароту ніколі не было. Гэта вынік і сумеснай дзейнасці, і інтэграцыйных працэсаў у рамках Саюзнай дзяржавы і Мытнага саюза».



Фота БЕЛТА.

Аб'ём узаемнага гандлю Беларусі і Расіі за студзень—май 2012 года перавысіў $19 млрд і склаў 125,1 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. На долю Расіі ў гэты час прыпадала амаль 47 працэнтаў агульнага аб'ёму знешняга гандлю Беларусі. У студзені—маі 2012 года экспарт ажыццяўляўся па 945 найменнях тавараў замест 905 у аналагічным перыядзе 2011 года.

Як адзначыў прэм'ер-міністр Расіі, у час сённяшняга пасяджэння саюзнага Саўміна плануецца абмеркаваць пытанні эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, узаемадзеяння ў абаронных, гуманітарных сферах: «У цэлым мы лічым, што нашы адносіны цяпер знаходзяцца на вельмі добрым узроўні, ёсць узаемаразуменне практычна па абсалютнай большасці бягучых спраў».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# БЫВАЙ, ФЕСТЫВАЛЬНЫ ГОРАД!

**Учора скончыўся XXI Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

Да наступнага года «Славянка» развіталася з Віцебскам. Пакінуўшы шмат уражанняў, шмат пераможцаў і шмат падстаў для разваг над удасканаленнем фестывалю.

Мабыць, і нечакана, але не менш прыемна. Удзельнікаў Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2012», якія прадстаўлялі Беларусь і Расію, вырашылі заахвоціць спецыяльнымі прызамі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Ад Рэспублікі Беларусь — Яўгена Славіча, ад Расійскай Федэрацыі — Анастасію.

Журы конкурсу, якое сёлета ўзначальваў добра вядомы кампазітар Максім Дунаеўскі, вырашыла ўзнагародзіць Луселію Ралдан — тую самую кубінскую конкурсантку, якая спявала песню на беларускай мове «Васількавае неба», — спецыяльнай прэміяй імя Уладзіміра Мулявіна за найлепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы, высокае выканальніцкае майстэрства.

ІІІ прэмію «Ліра» было вырашана падзяліць паміж дзвюма ўдзельніцамі. Такім чынам, прыз у 3 тысячы долараў напалам падзеляць італьянка Федэрыка Марынары і Славіна Калканджыева з Балгарыі. Бабан Майсоўскі з Македоніі — уладальнік Гран-пры. І-ю і ІІ-ю прэміі атрымалі Саманта Ціна з Латвіі і Галіна Конах з Украіны адпаведна. Астатнім канкурсантам прысвоілі званне дыпламантаў конкурсу.



Фестываль — гэта выдатны настрой і радасць.
На гала-канцэрце майстроў мастацтваў Украіны спявае Наталля ВАЛЕЎСКАЯ.

Фота БЕЛТА.

Радзівон Бас, дырэктар «Славянскага базару ў Віцебску», паабяцаў і надалей здзіўляць удзельнікаў і гасцей фестывалю разнастайнасцю і арыгінальнасцю творчага падыходу.

Адгрымеў канцэрт урачыстага закрыцця фестывалю. Але яшчэ сёння адбудуцца два канцэрты ў Летнім амфітэатры — сольнае выступленне Аляксандра Новікава і канцэрт «Зоркі Шансон-ТВ». Пасля чаго ў «амфіку», як пяшчотна называюць Летні амфітэатр мясцовыя жыхары, музыка «Славянскага базару» сціхне. Хочацца верыць, што ў наступным годзе ў Віцебск прыедзе шмат цікавых выканаўцаў розных стыляў. Добрае спалучэнне было, напрыклад, у 2011 годзе, калі ўдалося спалучыць Лаліту і Ніно Катамадзэ, «Сярэбранае вяселле» Святланы Бень, «Троіцу» і «Сяброў» у адным фестывалі. Так абяцаная разнастайнасць сапраўды набывае рэальныя абрысы.

**Зоя СВЕТЛАЯ.** СТАР 3

## АДНОСІНЫ РАСІІ І БЕЛАРУСІ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА ЎЗДЫМЕ

Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў напярэдадні пасяджэння саюзнага Саўміна. Учора быў падпісаны генеральны кантракт па будаўніцтве атамнай электрастанцыі ў Беларусі. «Гэта самы маштабны праект, яго агульны кошт ацэньваецца ў $10 млрд. Спадзяюся, што ён дасць і неабходны мультыплікацыйны эфект, будзе флагманам расійска-беларускага ўзаемадзеяння», — сказаў Дзмітрый Мядзведзеў. Аднак на атамным праекце, на яго думку, бакі не павінны замыкацца. Ёсць цэлы набор іншых вельмі важных і сур'ёзных праектаў, якія цяпер праходзяць апрабацыю. Дзмітрый Мядзведзеў выказаў упэўненасць, што яны будуць рэалізаваны.

Прэм'ер Расіі адзначыў, што на пасяджэнне саюзнага Саўміна вынесены насычаны парадак дня. Паводле яго ацэнкі, зараз паміж краінамі намеціўся перыяд канцэнтрацыі намаганняў па развіцці інтэграцыі, развіцці і ўмацаванні стратэгічнага партнёрства. Таму ў рамках Саюзнай дзяржавы, Мытнага саюза, АЭП адбываецца паглыбленне інтэграцыйных працэсаў. «Для Расіі інтэграцыя з Беларуссю застаецца ключавым прыярытэтам», — падкрэсліў Дзмітрый Мядзведзеў.

Беларусь выступае за стварэнне роўных умоў для расійскіх і беларускіх вытворцаў на рынку Адзінай эканамічнай прасторы. Аб гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на перагаворах са старшынёй урада Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым на двухбаковай сустрэчы ў пашыраным фармаце.

«Яшчэ раз хачу падкрэсліць, што ў нас галоўная мэта — гэта роўныя правы і роўныя ўмовы для нашых кампаній», — заявіў Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго слоў, бакі сур'ёзна рушылі наперад у фарміраванні АЭП, але пакуль адзінага рынку, па сутнасці, няма, існуюць розныя выключэнні і абмежаванні. «Трэба ўстараняць гэтыя выключэнні, каб працавалі сапраўды адзіны рынак, там больш з улікам членства Расіі ў СГА», — дадаў прэм'ер-міністр Беларусі.

На яго думку, асобныя пазіцыі і пытанні, якія ёсць па транспартным абслугоўванні, могуць быць прадметам работы Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі і Расіі мноства актуальных пытанняў для сумеснага абмеркавання. Гэта добрая прыкмета, якая сведчыць аб тым, што інтэграцыя дзвюх краін развіваецца па многіх напрамках. Асноўныя пытанні двухбаковага партнёрства абмяркоўваліся ўчора на сустрэчы ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

**БЕЛТА.**

# НА ПРОДАЖЫ АЎТАХЛАМУ МОЖНА БУДЗЕ ЗАРАБІЦЬ

**Як ачысціць нашы гарады ад аўтахламу? Закон не абавязвае ўладальнікаў утылізаваць транспарт, які ўжо адслужыў. Вось і ржавеюць кінутыя машыны ў дварах і на імправізаваных сметніках...**

На першы погляд, людзям яны нічым не пагражаюць, толькі займаюць месца і псуюць выгляд двароў. Але не ўсё так проста. Як заявіў **галоўны спецыяліст упраўлення абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей ЮРЧА**, кінуты аўтамабіль небяспечны для навакольнага асяроддзя. Акзавецца, машынныя фільтры, змазачныя рэчывы, адпрацаванае маторнае масла — усё гэта небяспечныя адходы, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе, што, у сваю чаргу, вядзе да пагаршэння

**У Беларусі сёння каля 30-40 тысяч аўтамабіляў ГАЗ, якія можна аднесці да металалому, з іх 80% знаходзяцца ў эксплуатацыі юрыдычных асоб. Ад 4 да 6 тысяч аўтамабіляў (па самых сціплых падліках) не эксплуатуецца ўласнікамі.**

нашага здароўя. Акумулятар, напрыклад, утрымлівае цяжкія металы. Шыны выдзяляюць забруджвальныя рэчывы ў паветра, а атмасферныя ападкі вымываюць таксіны з гумы непасрэдна ў грунт. Небяспечным у аўтамабілі з'яўляецца таксама электраліт. Усе гэтыя рэчывы атручваюць навакольнае асяроддзе, а следам — і нашы арганізмы.

### ВЫЙСЦЕ ПРАПАНАВАНА

Між тым, у маі стартавала **Першая беларуская праграма ўтылізацыі камерцыйнага транспарту**. Пра гэта паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі **генеральны дырэктар ЗАТ «Кіруючая кампанія холдынга «БелГАЗаўтасэрвіс» Міхаіл СУПРУНОВІЧ**. З падобнай ініцыятывай, паводле яго слоў, выступіў расійскі холдынг «Група ГАЗ». Дарэчы, аналагічная праграма ўжо дзейнічае ў Расіі. Дзякуючы ёй было ўтылізавана каля 600 тысяч аўтамабіляў.

На жаль, камунальная праграма здачы нехадавога аўтамабіля ва ўтыль сёння ў нашай краіне з'яўляецца досыць складанай. Гэта доўгая працэдура, якая, да таго ж, абыдзецца кліенту ў суму да 4 млн рублёў. Між тым, першая беларуская праграма ўтылізацыі камерцыйнага транспарту прадугледжвае, што аўтамабіль кліента прымаюць на сэрвіс, разбіраюць, адлучаючы металічныя дэталі ад неметалічных, прадастаўляюць кліенту кампенсацыю за металалом і каштоўныя металы (прыблізна каля 3 млн рублёў), а таксама — зніжку на набыццё новага аўтамабіля. З назвы праграмы вынікае, што яна дзейні-

**«Група ГАЗ» — найбуйнейшы расійскі вытворца камерцыйнага аўтатранспарту і будаўніча-дарожнай тэхнікі. У яе склад уваходзяць ААТ «ГАЗ», 18 аўтамабілебудаўнічых прадпрыемстваў у Расіі, збытавыя і сэрвісныя структуры. Штаб-кватэра кампаніі размешчана ў Ніжнім Ноўгарадзе.**

чае толькі для камерцыйных арганізацый (пакуль). Пры гэтым, як паведамляюць арганізатары, здаць можна не толькі «газаўскі» аўтамабіль, але і машыну любой іншай маркі. Зніжка на кожны набыты па гэтай утылізацыйнай праграме аўтамабіль складзе 26 млн беларускіх рублёў. Адзіная ўмова — гэтая зніжка дзейнічае толькі пры куплі аўтамабіля маркі ГАЗ.

У 2012 годзе ў рамках праграмы плануецца ўтылізаваць каля 300 аўтамабіляў маркі ГАЗ, што дасць магчымасць на працягу гэтага года, акрамя ўсяго іншага, папоўніць бюджэт краіны ў выглядзе падаткаў на суму больш за 15 млрд беларускіх рублёў. Сам аўтамабіль, які паступіў на ўтылізацыю, пасля разборкі будзе перададзены на Беларускі металургічны завод, што дасць магчымасць забяспечыць яго сыравінай.

Гендырэктар ЗАТ «Кіруючая кампанія холдынга» БелГАЗаўтасэрвіс» Міхаіл Супруновіч адкрыта прызнаецца, што вышэйназваная праграма для кампаніі пакуль нявыгадная. «Мы занялася праграмай утылізацыі ў гэтым годзе, паколькі зніжаецца продаж аўтамабіляў на беларускім рынку, — тлумачыць ініцыятыву гендырэктар. — Так, у 2011-м холдынг прадаў 1200 аўтамабіляў беларускім пакупнікам, тады як раней атрымлівалася рэалізоўваць каля 2600 аўтамашын, а ў асобныя гады продажы даходзілі да 4,5 тыс. адзінак.

Пакуль праграма дзейнічае толькі ў Мінску, але, як абяцаюць спецыялісты, у хуткім часе ў яе будуць уцягнуты і рэгіёны. Акрамя таго, не выключана, што ў бліжэйшай будучыні яна распаўсюдзіцца і на фізічных асоб. Зараз кіруючая кампанія холдынга «БелГАЗаўтасэрвіс» ужо атрымала 84 звароты ад камерцыйных арганізацый, на ўтылізацыю здадзены 31 аўтамабіль.

**Святлана БУСЬКО.**

## ДРУГАЯ ПАРТЫЯ ГУМАНІТАРНАГА ГРУЗУ АПЕРАТЫЎНА ДАСТАЎЛЕНА Ў КРЫМСК

**Пра гэта паведаміў карэспандэнту БелТА член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Яўген Мельнікаў, які суправаджаў гуманітарны груз.**

Груз таксама суправаджалі намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктар Гумінскі, намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі Аляксандр Шамко, работнікі МНС.

«Жыхары і кіраўніцтва горада не чакалі, што так аператыўна паступіць другая партыя грузу», — падкрэсліў дэпутат. Таксама ў Крымску звярнулі ўвагу, што некаторыя іншыя краіны СНД увогуле пакуль не аказалі дапамогі.

Усяго было дастаўлена грузу на Br2 млрд.

У пацярпелыя ад навяднення раёны Краснадарскага краю Расіі па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі было накіравана дзве партыі гуманітарнай дапамогі. Гуманітарныя грузы даставілі на самалёце Іл-76.

### АБЗАЦ

◢ Сярэдні памер пенсій па ўзросце ў чэрвені склаў у краіне 1 млн 472,7 тыс. рублёў, па інваліднасці — 1 млн 292,9 тыс. рублёў, з прычыны страты карміцельца — 925,5 тыс. рублёў, сацыяльных пенсій — 689,2 тыс. рублёў. Паводле звестак Белстата, у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне сёлета ў чэрвені на ўліку стаяла 2 млн 498,1 тыс. пенсіянераў.

**◢ Кран упаў на будоўлі ў Мінску — пацярпелі трое мантажнікаў. Здарэнне адбылося каля цэнтра «Тытан» 18 ліпеня. На новабудоўлі пры мантажы крана КБ-473 адбылося падзенне стралы. Пацярпелыя мантажнікі шпіталізаваны.**

### ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ Гіганцкі торт спяклі ў балівійскім горадзе Ла-Пас. Дэсерт прысвяцілі самай высокай гары краіны. Торт атрымаўся 7 м у вышыню і 5 — у даўжыню. У Паўднёвай Амерыцы такога торта не пёк ніхто. Кулінарны шэдэўр вырабілі да 200-годдзя вызвалення сталіцы краіны Ла-Пас. У працы па выпечцы прынялі ўдзел 85 кандытараў. Яны выкарысталі 11 тыс. яек і 7 мяхоў цукру. Толькі для крэмавай начынкі спатрэбілася 300 л малака, а на ўпрыгожванне — 20 кг цукровай пудры. На выраб торта пайшоў тыдзень. Для начынкі выкарысталі таксама клубніцы, шакалад і карамель. Гатовы выраб на двух грузавіках даставілі да цэнтральнай плошчы, разрэзалі на 10 тыс. кавалкаў і раздалі ўсім ахвотным. Такі падарунак гараджане запомняць надоўга.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## Вандалы зноў сапсавалі помнік у Ваўкавыску

**Памятны знак, усталяваны ў гонар 600-годдзя Грунвальдскай бітвы, пацярпеў трэці раз. Невядомыя скралі дзяржальна аднаго з мячоў, што прымацаваны да каменнай стэлы.**




— Мы не можам зараз нічога сказаць пра матывы гэтага ўчынку, бо невядомы тыя, хто яго здзейсніў. Быў гэта акт вандалізму, крадзеж ці яшчэ нешта, пакуль незразумела, — паведаміла карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы Ваўкавыскага райвыканкама Святлана Вараніца. — Гэта ўжо трэці выпадак, калі помнік пашкодзілі. Летась спачатку гэтак жа знікла дзяржальна аднаго з мячоў, другі не прымусіў сябе чакаць. Што датычыць нядаўняга здарэння, дык супрацоўнікі ваенна-гістарычнага музея імя Баграцёна, побач з якім знаходзіцца памятны знак, заўважылі адсутнасць часткі аднаго з мячоў пасля выхадных. Цяпер вось дзяржальна адламалі, але ў мінулы раз здолелі выцягнуць і меч, што знаходзіцца ў камені.

Ва ўнітарным прадпрыемстве «Ваўкавыская камунальная гаспадарка», якое адказвае за памятны знак, вельмі занепакоены, што непрыемная сітуацыя паўтараецца:

— Пасля мінулай восені, каб заказаць і адліць у Лідзе новыя мячы і адрамантаваць помнік, давялося патрацiць больш за чатыры з паловай мільёны беларускіх рублёў, — расказаў намеснік кіраўніка па ідэалагічнай рабоце ўнітарнага прадпрыемства «Ваўкавыская камунальная гаспадарка» Мікалай Нарута.

Па факце здарэння Ваўкавыскі РАУС праводзіць праверку. Нагадаем, што памятны знак у гонар 600-годдзя Грунвальдскай бітвы быў усталяваны летась,16 ліпеня, і ўжо восенню пацярпеў ад вандалаў. 13 ліпеня гэтага года, да свята горада, помнік здолелі аднавіць. Мячы, якія і з'яўляюцца аб'ектам злачыннай цікавасці, зроблены з сілуміну (сплаў алюмінія з крэмніем).

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ

**«Минский областной центр инвестиций и приватизации» ИНФОРМИРУЕТ:**

в связи с внесением изменений в базу единого государственного регистра недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, в извещении о проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимости ОАО «Солигорскторг», опубликованном в газете «Звязда» от 28.06.2012, **вносится изменение по Лоту № 1 (склад продовольственных товаров № 1):** вместо слов «Объект обременен договором аренды (часть строения пл. 140 кв.м в аренде по 14.07.2013)» **читать «Объект не обременен договорами аренды».**

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## 10 КГ РАКАЎ НА 40 МЛН. І КРЫМІНАЛЬНЫ АРТЫКУЛ

Работнікі Мсціслаўскай міжрайінспекцыі праверылі аўтамабіль, у якім ехалі двое грамадзян, і знайшлі там 10 ракаловак і 184 асобіны вузкапалага рака агульнай вагой 7 кілаграмаў. Шкода прыродным рэсурсам склала больш як 27 мільёнаў рублёў.

«Падчас таго ж прыродаахоўнага рэйду дзяржінспектары праверылі яшчэ адзін аўтамабіль, дзе знаходзіліся таксама двое грамадзян, адзін з якіх — жыхар Расійскай Федэрацыі, — паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. — У машыне былі знойдзены 5 ракаловак і 93 вузкапалыя ракі. Агульная вага здабычы склала больш за 3 кілаграмы». Шкода ацэнена ў 14 мільёнаў рублёў. Варта падкрэсліць, што ракаў браканьеры здабывалі ў перыяд забароны на іх лоўлю. У абодвух выпадках затрыманых чакае крымінальная адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## МЯСА ВЫВОЗІЎ НА СЛУЖБОВЫМ АЎТАМАБІЛІ

Нарадам аддзела «Аховы» на прахадной Аршанскага мясакансервавага камбіната быў затрыманы 32-гадовы работнік прадпрыемства, які на службовым аўтамабілі «ГАЗ» спрабаваў вывезці выкрадзеныя мясапрадукты агульным коштам 13,5 мільёна рублёў.

Заведзена крымінальная справа. Максімальнае пакаранне, якое прадугледжана Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь за такое злачынства, — пазбаўленне волі тэрмінам да трох гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЖЫЦЦЁ — ЯК ЗЕБРА

У Магілёве прайшла аперацыя «Зебра»: за 4 гадзіны 74 вадзіцелі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў праезду пешаходных пераходаў.

Паводле статыстыкі, за паўгода ў Магілёўскай вобласці на пешаходных пераходах пад коламі аўтамабіля загінуў 1 чалавек і 16 атрымалі траўмы. Таму Магілёўская ДАІ рэгулярна робіць папераджальныя акцыі на аварыйна небяспечных пешаходных пераходах: адна з іх, дарэчы, праводзілася як «эстафета бяспекі», калі самі вадзіцелі дзяжурылі на тых пераходах, дзе яны парушылі правілы. Прычым за парушэнне праезду пешаходных пераходаў можна атрымаць штраф да 5 базавых велічынь — ажно да паўмільёна рублёў!

**Ілона ІВАНОВА.**

# Шпацыр па Камароўцы

## Пінскія памідоры каштуюць даражэй за прывазныя ўкраінскія, а персікі ідуць на кампоты



— Колькі просіце за паўлітра чарніц? — пытаюся ў камароўскіх прадаўцоў, якія размясціліся непадалёк ад увахода на рынак.

— Аддаём за пятнаццаць, — адказваюць мне.

Яшчэ месяц таму, калі сезон лясной прадукцыі толькі набіраў сілу, гэтую ж колькасць ягад прадавалі за 20 тысяч рублёў. Змяніліся кошты, іншыя змены пакупнікі таксама заўважылі.

Літаральна за некалькі тыдняў гандлёвыя латкі Камароўкі прыкметна пацяжэлі. Удалося знайсці не толькі звыклую гародніну і садавіну, якой на рынку заўжды даволі, але і, напрыклад, жоўтую чарэшню, маладую кукурузу, буякі.

Адразу варта сказаць пра беларускія лясныя грыбы-ягады. Чарніц пакуль што на рынку хапае. Зніжкі на лясную прадукцыю, «абяцаныя» героямі мінулага камароўскага рэпартажу (*гл. «Звязду» за 26 чэрвеня 2012 г.*), чарніцы, відавочна, закранулі. Але, як высветлілася, дзе адным зніжкі, іншым дорага. Пытаюся кошт не за паўлітра ягад, а за кілаграм. Мужчына са Смалявіч просіць 30 тысяч за кілаграм. Прытым што, напрыклад, пад Брэстам чарніцы ў людзей купляюць па 22 тысячы за кілаграм, і гэта лічыцца добрай цаной, а 30 тысяч — гэта ўжо нечуваныя грошы.

Лісічкі на Камароўцы прадаюць у сярэднім па 50 тысяч за кілаграм. А вось лясныя суніцы, якія ўжо амаль прайшлі, як і раней, каштуюць 25 тысяч за паўлітра. На рынку гэтыя ягадкі цяпер — своеасаблівая рэдкасць.

Што датычыць агародніны, то зараз, па словах прадаўцоў, найбольш актыўна купляюць агуркі і зеляніну для салатаў, баклажаны, капусту. Традыцыйна не залежваюцца памідоры. Апошнія, дарэчы, крыху здзівілі. Кошт на таматы з Украіны вагаецца ад 11 да 13 тысяч рублёў. Гэта прыгожыя буйныя памідоры без чорных плямачак і пабітых бакоў. Хочаш у салату рэж, хочаш у слоікі закладвай. Спрабую знайсці беларускія памідоры і тут жа бачу цэннік з патрэбным надпісам «Пінск», побач з якім кошт — 25 тысяч рублёў за кіло. Лічы, удвая даражэй!

— А чаму так дорага?

— Проста гатунак адмысловы, «малінавыя» памідоры, — растлумачылі мне.

Аказваецца, сутнасць «малінавасці» і, адпаведна, лішняй «дзясяткі» ў кошце, у салодкім смаку, крыху ружовым колеры памідораў і больш складаных умовах вырошчвання:

— Калі пад Херсонам пасадзіш гэты памідор у глебу, ён і вырасце, дык у нас кіламетр плёнкі на цяпліцу патрэбна, — падзяліліся вопытныя агароднікі няхітрым сакрэтам.

Беларускія таматы звычайнага гатунку можна набыць у межах 15-17 тысяч.

Маладая бульба патаннела няяначна. Самыя вялікія, памерам з кулак, клубні — 5 тысяч за кіло (раней каштавалі 6).

...«Салодкі, спелы, мядовы» — усе гэтыя кампліменты належаць зялёнаму і паласатаму кавуну. Пішуцца гэтыя «кампліменты» традыцыйна проста на цэнніках, і

### КАМАРОЎСКІ «ПРЭЙСКУРАНТ»
*(кошт за кілаграм)*

<u>Заморская смаката:</u>
**Вінаград** (гатунак «мускат») — 15-25 тыс.
**Персік** — 17-18 тыс.
**Нектарын** — 20 тыс.
**Абрыкос** — 20 тыс.
**Вішня** — 30-45 тыс.
**Сліва** — 15 тыс.
**Кавун** — 5 тыс.
**Дыня** — 20 тыс.
**Памідоры** — 11-13 тыс.
**Перцы** — 32 тыс.
**Баклажан** —13 тыс.

<u>Наша, родненькае:</u>
**Агуркі** — 5 тыс.
**Памідоры** — 15-25 тыс.
**Маладая кукуруза** — 5 тыс.
**Чарніцы** — 30 тыс.
**Буякі** — 30 тыс.
**Маладая бульба** — 3-5 тыс.

паспрабуй праявіць хоць бы якое сумненне.

— Гэта вы краснадарскі каштуеце, — тлумачыць мне Наталля, што гандлюе на Камароўцы садавінай. — Зараз ужо адносна бяспечна можна кавуны есці, гэта ў чэрвені ўсе «хімічных» баяліся.

Дарэчы, кошт кавуна на Камароўцы — у сярэднім 5 тысяч рублёў за кілаграм. Можна адразу ж спакусіцца і набыць яшчэ дыню, што, праўда, абыдзецца даражэй. Недзе 15-20 тысяч за кіло.

Дыні на Камароўцы ў асноўным узбекскія.

Сакавітыя персікі і нектарыны вязуць з Еўропы. На рынку — у асноўным іспанскія і італьянскія. Дзе-нідзе — Грэцыя.

— Сёлета персікі па добрай цане, — дзеліцца Наталля. — 18 тысяч — гэта сярэдняя. Такія яшчэ паляжаць некаторы час, бо цвердаватыя. Калі любіце, каб мяккія і сакавітыя, магчыма і танней знайсці.

Можна паласавацца, з'еўшы адзін-два персікі, але трапляюцца і больш грунтоўныя пакупнікі:

— Нядаўна адна жанчына з вёдрамі прыйшла, купіла некалькі кілаграмаў. Казала: «Хачу кампотаў накруціць».

Завяршаючы шпацыр, выпашыла даведацца пра прагнозы адносна коштаў. На гэты раз прадаўцы паабяцалі, што хутка варта чакаць змяншэння цэн на кавуны. А яшчэ — большага попыту на памідоры. Надыходзіць самы час для гаспадынь, што плануюць нарабіць на зіму нарыхтовак.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ЮБІЛЕЙНЫ «БАЗАРЧЫК» ВЯЛІКАГА «БАЗАРУ»

## Учора вечарам на «базары» сталі вядомы прозвішчы пераможцаў конкурсу маленькіх выканаўцаў

**Сёлета «базарнаму» міжнароднаму дзіцячаму музычнаму конкурсу «Віцебск» — 10 гадоў. І, безумоўна, да дзіцячага конкурсу заўжды тут ставіцца, можна сказаць, з матчынай любоўю. А як жа інакш? Так, канкурсанты, змагаюцца за Гран-пры і прэміі, але ж выканаўцы такія маленькія: старэйшым толькі 12 гадоў, а меншым — усяго 7. Таму іх і «песцяць», і калі трэба, суцяшаюць. Арганізатары стараюцца, каб юныя таленты, якія не змаглі на «базарчыку» поўнасцю раскрыць свой талент, не з'язджалі з фестывальнага Віцебска ў дрэнным настроі, з крыўдай у душы.**


Фота БЕЛТА.
Марыям БІЧАШВІЛІ (Грузія).

Сёлета маленькія канкурсанты нечакана для сябе на «базарчыку» апынуліся ў чароўнай краіне, у Смарагдавым горадзе. Упершыню трапілі туды падчас лёсавання ў цудоўным комплексе адпачынку над Заходняй Дзвіной. А потым казка працягвалася. Смарагдавы горад пераехаў у канцэртную залу «Віцебск», дзе па традыцыі праходзіць «маленькі базарчык». Зала істотна абнавілася пасля капітальнага рамонту.

Першы дзень конкурсу прыпаў на панядзелак. Адзін з вядучых, вядомы як дзядзька Ваня (Іван Вабішчэвіч), з'явіўся на сцэне ў вобразе чараўніка-ўладара горада ў... карзіне імправізаванага паветранага шара. А перад гэтым у поўнай цемры на сцэне «ажывалі» кулісы і пераўтвараліся ў казачныя «карціны». Казачныя героі са Смарагдавага горада — Жалезны Дрывасек, Чучала, Леў і іншыя дапамагалі вядучым весці конкурсны канцэрт. Адной з чароўных прынцэс-вядучых стала юная беларуская «зорачка» Аляксандра Няхай, якая паспяхова выступіла на адным з «базарчыкаў» у якасці канкурсанткі. Другой прынцэсай стала прадстаўніца Расіі Даша Сінюгіна.

Старшыня журы X Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2012», кампазітар і спявак Джамал Сепіяшвілі прыемна здзівіў, калі выйшаў на сцэну перад пачаткам праслухоўвання канкурсантаў і сам праспяваў на грузінскай мове. Песня суправаджалася фактычна міні-спектаклем, таму ўсе зразумелі, што спявае «галоўны суддзя» аб дзецях, якія вырастаюць і пачынаюць самастойнае жыццё, потым жэняцца, самі выхоўваюць дзяцей. У многіх гледачоў наварочваліся на вочы слёзы.

Вельмі цёпла гледачы сустракалі ўсіх канкурсантаў. Публіка доўгімі авацыямі падтрымлівала беларусак Яўгенію Кляпіцкую і Лізу Мураўёву. Калі ў першы дзень канкурсанты выконвалі песню кампазітара той краіны, якую прадстаўлялі, у другі — песню па сваім выбары.

**Гран-пры** (5 тысяч долараў) — Грузія, Марыям Бічашвілі, 11 гадоў.
**Першая прэмія** (3 тысячы долараў) — Казахстан, Алішэр Жаксыбай, 10 гадоў.
**Другая прэмія** (2 тысячы долараў) — падзялілі паміж трыма ўдзельніцамі:
Румынія — Дыяна, 9 гадоў,
Узбекістан — Шухрат, 9 гадоў,
Украіна — Паліяна Рыжак, 8 гадоў.
**Трэцяя прэмія** (1 тысяча долараў) — Літва, Паўліна Скрабітэ, 11 гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ У свеце

# Тэракт у Дамаску: забітыя два міністры і зяць прэзідэнта Асада

**У Дамаску, дзе праціўнікі прэзідэнта Башара Асада раней развязалі вулічную вайну з абаронцамі рэжыму, у сераду здзейснены беспрэцэдэнтны тэракт. У выніку выбуху ў будынку Службы нацыянальнай бяспекі ў прэстыжным раёне ў цэнтры сірыйскай сталіцы, як паведамляецца, забіты два міністры і блізкі сваяк кіраўніка дзяржавы.**

Загінуў міністр абароны Сірыі Дауд Раджыха, паведамляе AFP са спасылкай на сірыйскае нацыянальнае тэлебачанне, адзначаючы, што кіраўнік ваеннага ведамства «прыняў пакутніцкую смерць». Па непацверджаных пакуль афіцыйна звестках, ад атрыманага ў выніку выбуху ранення памёр і намеснік міністра абароны па пытаннях бяспекі Асэф Шаўкат, муж сястры прэзідэнта Сірыі Башара Асада Бошры, піша ІТАР-ТАСС.

Сярод параненых аказаўся кіраўнік МУС Сірыі Мухамед аш-Шаар. Міжарабскі тэлеканал Аль-Арабія са спасылкай на ўласныя крыніцы перадае, што ён неўзабаве памёр ад ран. У той жа час афіцыйнае тэлебачанне сцвярджае, што аш-Шаар жывы і знаходзіцца ў стабільным стане, адзначае BBC.

Цяжка параненыя і іншыя высокапастаўленыя чыноўнікі. Так, паведамляецца аб тым, што атрымаў цяжкія раненні і кіраўнік сірыйскай разведкі Хішам Бехціяр. Дакладнай інфармацыі аб колькасці загінулых і параненых пакуль не прыводзіцца.

Тэракт адбыўся падчас сустрэчы міністраў і шэрагу кіраўнікоў сакрэтных службаў, удакладняе Reuters. Па некаторых звестках, выбуховае прыстасаванне ў дзеянне прывёў тэрарыст-смяротнік, які працаваў целаахоўнікам, адказваў за бяспеку бліжэйшых паплечнікаў Асада і які знаходзіўся альбо паблізу будынка, альбо ўнутры ■

## ГУЛЯЦЬ — У КАТЛАВАН?

Тры школьнікі днём пайшлі гуляць у катлаван памерам 5x14 і глыбінёй 2 м, выкапаны на ўскраіне вёскі Звяняцкае Хойніцкага раёна для «ўтылізацыі» закінутай хаты. Яма, якая знаходзіцца на тэрыторыі сельскага Дома культуры, з боку вуліцы агароджана драўляным плотам. Непаўналетнія (два браты і сябар) выкапалі паглыбленні пад насыпам грунту, у выніку чаго адбылося яго абвальванне. Як расказалі ў Следчым камітэце па Гомельскай вобласці, у 17.00 шукаць хлопцаў накіраваўся старэйшы брат аднаго з іх. Ён пабачыў, што ў катлаване абрынуўся грунт, і пачаў раскопваць завал. Калі знайшоў цела загінулага брата, паклікаў мясцовых жыхароў, якія працягнулі раскопкі. Сумесна з супрацоўнікамі МНС і міліцыі на месцы трагедыі былі знойдзены целы і двух іншых хлопчыкаў. Двайм дзецям было па 12 гадоў, аднаму — 10. Дарэчы, апошняя аналагічная трагедыя на Гомельшчыне адбылася два тыдні таму на пясчаным кар'еры ў Калінкавіцкім раёне. Тады загінулі два школьнікі з аграгарадка Залатуха.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НАПАД НА ТАКСІСТА РАСКРЫТЫ

**Разбойны напад на 34-гадовага таксіста, які адбыўся ў Полацкім раёне, раскрылі ўсяго за пару сутак. Аб гэтым паведамілі «Звяздзе» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама.**

Увечары на індывідуальнага прадпрымальніка з Полацка, які аказвае паслугі па перавозцы пасажыраў на сваім аўтамабілі, напаў пасажыр. Малады мужчына, які папрасіў даставіць яго на возера ў вёску Тросна, калі прыехалі на месца, замест аплаты па лічыльніку дастаў нож. Здабычай рабаўніка сталі 460 тысяч рублёў. Індывідуальны прадпрымальнік быў дастаўлены ў бальніцу з мноствам нажавых ран у жывот, грудзі, галаву і нагу. Злодзею ўдалося ўцячы.

Узаемадзеянне аператыўных службаў УУС, полацкіх раённага і гарадскіх аддзелаў міліцыі, экспертна-крыміналістычнага падраздзялення і Следчага камітэта дазволіла на працягу двух сутак раскрыць злачынства. Затрыманы жыхар Полацка 1987 года нараджэння, якому інкрымінуецца разбой. Напад на таксістаў у апошнія гады — рэдкая з'ява. Падобны выпадак адбыўся на тэрыторыі Расонскага раёна ў 2009 годзе. Двое хлопцаў у стане алкагольнага ап'янення забілі кіроўцу таксі з Наваполацка. Як высветлілася, маладыя людзі хацелі завалодаць аўтамабілем. Праваахоўныя органы хутка раскрылі злачынства пры дапамозе таксістаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# САМА САБЕ МЕТЭАРОЛАГ

**Жнівень будзе цёплы і сухі. Якраз для жніва, бо чакаецца надзвычай добры ўраджай збожжавых. Затое восень, вельмі верагодна, будзе мокрай, а маразы пачнуцца ў снежні. Такі прагноз зрабіла Тамара ГАРАНІНАВА, жыхарка аграгарадка Свяцілавічы ў Бялыніцкім раёне, паводле народных прыкмет.**

## ВЫЗНАЧАЛЬНЫЯ КАЛЯДЫ

Што рыхтуе надвор'е, прынамсі ў Свяцілавічах, могуць даведацца ўсе цікаўныя мясцовыя людзі. Не са сродкаў масавай інфармацыі, а з першых вуснаў. Тут уласную, так бы мовіць, метэанезалежнасць забяспечвае адна разумная і назіральная жанчына. «Хобі» Тамары Гаранінавай — звязаныя з прыродай старажытныя прыкметы. Яна — народны метэаролаг.

Аднойчы маці расказала ёй, як можна вызначыць надвор'е на ўвесь будучы год. Аказваецца, што 12 дзён на мяжы старога года і новага, ад каталіцкіх да праваслаўных Каляд, якраз і даюць дасведчанаму чалавеку магчымасць зрабіць доўгатэрміновы прагноз.

— Гэта такая крыху містычная гісторыя, — расказвае Гаранінава. — Аднойчы мацi ў аўтобусе пазнаёмілася са старым чалавекам, які шмат ведаў аб прыродзе і жыцці чалавека ў ёй. Ён і расказаў пра гэтую калядную прыкмету. **Кожны з 12 дзён ад 26 снежня да 6 студзеня вызначае надвор'е ў кожным месяцы наступнага года** — паводле аналогіі. Я зацікавілася, стала сама назіраць, і шмат чаго спраўджваецца. Прырода нібыта дае нам падказкі.

## БЯРОЗА РАСКАЖА ПРА ЗІМУ

Цяпер праверыць гэта ёсць магчымасць і ў чытачоў «Звязды». А можа, і паспрабаваць самастойна зрабіць прагноз?

— Вось вам першая дакладная прыкмета, — пачынае Тамара Аляксееўна. — **Калі ўвосень бяроза ўся жаўцее адначасова — значыць, зіма будзе аднолькавая**. Калі жаўцее спачатку ўнізе, то першая палова зімы чакаецца асабліва халоднай. Калі сярэдзіна — апраўдае сваю назву люты. Калі верхавіна — канец зімы будзе суровы, вясны і цяпла давядзецца пачакаць.

Бярозы на тэрыторыі Свяцілавіцкага сельскага цэнтра культуры, які шмат гадоў узначальвае Тамара Аляксееўна, нягледзячы на ліпень, ужо пачынаюць мяняць колер лісця. Толькі, здаецца, яно не жаўцее, а з-за спякоты становіцца сухім. Калі прыкмета дзейнічае, то сапраўды пачатак зімы не павінен быць у сумным «восеньскім» стылі, які надакучыў усім у мінулым сезоне.

— Я людзям казала, што май і чэрвень будуць мокрымі, а ліпень чакаецца цёплы, з невялікімі дажджамі, — расказвае народны метэаролаг. — І гэта праўда! Аднак трэба ведаць, што дзеянне прыкмет распаўсюджваецца на тую мясцовасць, дзе яны назіраюцца. Глядзіце вакол і рабіце высновы!

## СПЯКОТЫ НЕ БУДЗЕ

Вельмі спякотныя дні і нават тыдні назіраюцца (і перажываюцца) у Беларусі ўжо не першы год. Якім жа будзе працяг цяперашняга лета? Тамара Гаранінава лічыць, што жнівень будзе цёплы і сухі, а надзвычайна высокіх тэмператур нам больш не давядзецца адчуць.

— Ну, можа толькі ў жніўні некалькі дзён каля 30 градусаў, і тое наўрад ці, — гаворыць яна.

Тут пашанцуе сялянам: надвор'е будзе спрыяць паспяховай уборачнай кампаніі. Тым больш што ўраджай павінен быць добры дзякуючы мокраму пачатку лета.



Наготкі лёгка «прадказваюць» дождж ці сонца ўлетку.

— Гэта ўсё працягнецца, паводле прыкмет, да 10-12 верасня, а потым прыйдзе сырасць, — гаворыць Тамара Аляксееўна. — А сваю ўпэўненасць наконт снежаньскіх маразоў я таксама магу растлумачыць: **які дзень быў 3 чэрвеня — такім будзе і 3 снежня**. У нас 3 чэрвеня быў дождж і нават град. Таму 3 снежня будзе падаць снег, такімі крупкамі. Вось запомніце, потым праверыце мой прагноз.

## ЗІМОВАЯ ВІШНЯ

Хто толькі і як толькі ні жартаваў над метэапрагнозамі! Хто з нас не ведаў, злавацца ці смяяцца (другі варыянт лепшы), калі ў аб'яўлены абсалютна сонечным дзень ішоў праліўны дождж? А хто не праводзіў свой дзень, млеючы ад спякоты, але з нязграбным і цяжкім парасонам у руках у поўнай адпаведнасці з прагнозам? Звычайныя жыццёвыя справы!



Тамара ГАРАНІНАВА са Свяцілавіч прадказвае надвор'е паводле старажытных народных прыкмет.
«Як жаўцее бяроза, такая і будзе зіма».

Надвор'е — капрызнае, цяжка прадказальнае, тым больш у наш час кліматычных змяненняў і катаклізмаў. Цяпер цяжка меркаваць, што рыхтаваць на зіму — валёнкі альбо гумавыя боты, ці трэба выязджаць у паўднёвы рай улетку, каб добра загараць.

Доўгатэрміновыя прагнозы, зробленыя спецыялістамі і разлічаныя сучаснай тэхнікай, усё ж такі здаюцца часам даволі цьмянымі. Ці працуюць у такім разе народныя прыкметы? Тамара Гаранінава ўпэўнена, што так, сапраўды працуюць.

Напрыклад, яна добра ведае, што **пакуль не ўпадзе апошняе лісце з вішні, зіма не пачнецца**. Летась зіма спазнілася — лісце на вішні трымалася вельмі доўга.

## ВЯЧЭРНЯЕ КУКАРЭКУ

Каля будынка цэнтра культуры — зялёны газон, клумбы з кветкамі, зробленыя сваімі рукамі садовыя скульптуры. Разам з карыснымі для здароўя чалавека прыгажунямі-эхінацэямі прытуліліся і добра знаёмыя наготкі.

— Калі кветкі цяпер закрытыя, то будзе дождж, — Тамара Аляксееўна глядзіць на хмарнае неба.

Змены ў надвор'і лепей за ўсё прадчуваюць жывёлы. Гаранінава мае вялікую падсобную гаспадарку, таму назірае за гэтым штодня. Напрыклад: калі дома сабакі і каты кладуцца, выцягнуўшыся — будзе цёпла, а клубком — холадна. А **калі ўвечары ў вёсцы пачынаюць кукарэкаць пеўні,** то абсалютна дакладна, незалежна ад пары года, **можна чакаць хуткую перамену надвор'я**.

Тамара Аляксееўна вядзе назіранні больш за 15 гадоў, але пры гэтым не мае ні шматка паперы: аматарка матэматычных дысцыплін нічога не запісвае, але добра запамінае.

**Расліны, зорнае неба, жывёлы — ва ўсім ёсць падказкі прыроды, лічыць народны метэаролаг.**

— Вы ведаеце, што ў нас ёсць два святы Юр'я: 9 снежня — восеньскі і 6 мая — веснавы. Колькі снегу будзе ляжаць на восеньскага Юр'ю, столькі травы вырасце на веснавога. Калі снегу не будзе ўвогуле, то трава можа вырасці, але май усё роўна будзе вельмі халодны.

## БУДУЦЬ БЯЛЫНІЦКІЯ АПЕНЬКІ

— Калі ўвосень да 25 лістапада лёг снег і праляжаў да 1 снежня, то ён, хутчэй за ўсё, яшчэ растане, і столькі дзён яшчэ не будзе зімы. На Пакровы 14 кастрычніка можна вызначыць зіму па напрамку ветру: паўднёвы — цёплая, паўночны — суровая.

— Можна карыстацца і зорным небам, — працягвае Гаранінава. — **Яшчэ ў студзені можна меркаваць, ці будзе ўраджайны год на дары лесу.** Калі з 6 на 7 студзеня на небе шмат зорак, то будуць ранія ягады (суніцы і чарніцы), а таксама грыбы-лісічкі. Калі неба зорнае з 13 на 14 студзеня — чакайце шмат маліны, брусніц, баравікоў, абабкаў. Калі зоркі парадавалі вас у ноч з 18 на 19 студзеня — рыхтуйцеся да грыбной кампаніі ўвосень. Сёлета, магу зрабіць справаздачу, **мы не чакаем шмат баравікоў, затое восеньскія апенькі парадуюць грыбнікоў**.

— Гэта да надвор'я не мае дачынення, але да жыцця чалавека напэўна: каля вашага дома абавязкова трэба пасадзіць два дрэвы — бярозу, каб аберагала ад бедаў і няшчасцяў, і таполю — як адвод маланкі. Гэта таксама старажытная народная прыкмета.

## СТАРАЖЫТНЫЯ ПРЫКМЕТЫ ПРАЦУЮЦЬ

Метэаталент Тамары Аляксееўны адкрыты для людзей. Яна сваіх назіранняў не хавае, усё расказвае і атрымлівае задавальненне, калі прыкмета спраўджваецца.

— Аднойчы быў выпадак з сенакосам, — узгадала Гаранінава. — Вы ж ведаеце, што сялянам даюць участкі, каб яны мелі сена на пракорм жывёлы. Гэтым разам далі іх у двух месяцах: у адным паспелі ўбраць, у другім — не паспелі, крыху спазніліся. Я тады сказала: 17 ліпеня пойдзе дождж і сенакос сапсуецца. Так і атрымалася.

Свае сакрэты яна вырашыла пакінуць у спадчыну дзецям. Яны, аднак, пакуль не вельмі цікавяцца старажытнымі ведамі. Аднак, можа, яны калі-небудзь і будуць дарэчы?

— Прырода будзе мяняцца, калі пачнуцца кліматычныя катаклізмы — могуць і нас захапіць, — мяркуе Тамара Аляксееўна.

Парушэнні экалогіі прымушаюць людзей пільна ўглядацца ў навакольнае асяроддзе, каб абараніць сябе ад катаклізмаў. У гэтым сэнсе Тамара Гаранінава — не адзіная ў Бялыніцкім раёне з людзей, якія цікавяцца прыродай і прыкметамі. Ёсць яшчэ Артур Вільнеўскі, жыхар вёскі Глыбокі Брод. Ды і бялыніцкіх краязнаўцаў вельмі цікавіць гэтая частка жыцця чалавека, якая цяпер стала надзвычай актуальнай.



З павагай да прыроды.

Нездарма ў журналістыцы ёсць тры класічныя тэмы, якія будуць найперш актуальнымі і цікавымі для людзей ва ўсе часіны: разам са здароўем і грашыма гэта — надвор'е. **Цёплага вам лета, прыгожай восені і сапраўднай зімы!**

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*Бялыніцкі раён.*

# СПЕЦНАЗ ПА БАРАЦЬБЕ З... БРАКАНЬЕРАМІ

## Упершыню пры Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі прайшоў спецыяльны збор упраўлення аператыўнага рэагавання



Падобны збор арганізавалі для таго, каб супрацоўнікі інспекцыі змаглі ўдасканаліць свае навыкі па выяўленні, спыненні і барацьбе з парушальнікамі. Падрыхтоўка адзіная ў сваім родзе ўпраўлення аператыўнага рэагавання ажыццяўляецца па спецыяльнай праграме, якая ўключае тэарэтычныя і практычныя заняткі. Між іншым, само ўпраўленне складаецца з трох аддзелаў — тут працуюць спецыялісты ў галінах лесакарыстання, паляўнічай гаспадаркі, а таксама рыбалоўства. Шмат хто з супрацоўнікаў мае досвед працы ў сілавых структурах. Затрымліваць парушальнікаў у балотнай мясцовасці, канваіраваць, выкарыстоўваць табельную зброю — усімі гэтымі навыкамі інспектары павінны валодаць дасканала.

«На занятках мы адпрацоўваем розныя варыянты. Гэта не значыць, што нашы супрацоўнікі штодня дзейнічаюць у экстрэмальных умовах, — дзеліцца сваімі ўражаннямі намеснік начальніка Дзяржаўнай інспекцыі Аляксандр Дунькові ч. — На шчасце, у нашай практыцы за апошнія гады амаль не было выпадкаў, калі мы ўжывалі фізічную сілу супраць парушальнікаў. Яны звычайна з разуменнем ставяцца да нашай працы. Максімум на што здольныя, убачыўшы супрацоўнікаў, — паспрабаваць уцячы. Але мы ведаем і іншыя выпадкі. Калі памятаеце, летась браканьерам быў забіты падлоўчы ў Бярэзінскім запаведніку. Менавіта з гэтай мэтай мы і праводзім падобныя прафесійныя зборы — каб заўсёды быць падрыхтаванымі. Адназначу, што факты масавага браканьерства ў рэспубліцы практычна не адзначаюцца, але яшчэ засталіся нядобрасумленныя грамадзяне, якія часам ідуць на супрацьпраўныя дзеянні. Тут на падмогу Дзяржаўнай інспекцыі і прыходзіць спецыяльнае падраздзяленне ўпраўлення аператыўнага рэагавання».

**Надзея БУЖАН, фота аўтара.**



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

19 ЛІПЕНЯ 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15699)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

# «ЧАРОЎНЫ ТРУСІК» ПРАЗ ТРЫ ГАДЫ

***Адна з самых таямнічых фігур беларускай эстрады — гэта бялявы хлопчык Юрый Дземідовіч. Ніколі яшчэ ўдзельнікі дзіцячага Еўрабачання не выклікалі столькі розных, прычым дыяметральна супрацьлеглых меркаванняў!***


Фота Надзеі БУЖАН.
Юра сёння...

*Каменем спатыкнення быў незразумелы і загадкавы прыпеў песні «Чароўны трусік». Сам Юра сцвярджаў, што ў ім проста выкарыстана гульня слоў. Шматлікія ж «прыхільнікі» слухалі тэкст задам наперад і шукалі схаваны магічны сэнс... Аднак нічога канкрэтнага знайсці не ўдалося, таму давялося пакінуць Юру ў спакоі.*

*У 2009-м на дзіцячым «Еўрабачанні» Дземідовіч адзначаў свой 13-ы дзень народзінаў. Цяпер Юру 15, аднак выглядае ён амаль гэтаксама, як два з паловай гады таму. Кантакты спевака я знайшла ў адной сацыяльнай сетцы. На старонцы было ўказана, дзе вучыцца хлопец, чым займаецца, якія ў яго інтарэсы. Інфармацыі аказалася дастаткова, каб хутка выйсці на маладога выканаўцу.*

*У гэтай жа анкеце маю ўвагу прыцягнулі біблейскія цытаты пра антыхрыста. Таксама там пазначалася, што любімы фільм спевака — трылер «Омэн» на гэтую ж тэму... Майму пытанню — чым абгрунтаваны такі выбар? — Юра вельмі здзівіўся. Аказваецца, гэта старонка ў інтэрнэце несапраўдная і да рэальнай асобы Дземідовіча не мае ніякага дачынення. Пашукаўшы, знайшла яшчэ з дзясятак старонак «Дземідовічаў» з выявамі Юры. І адрозніць, якая з іх сапраўдная, было проста немагчыма. Хлопчык распавёў, што «пад яго» было зроблена шмат фальшывак у сацыяльных сетках, дзе пісалі розныя не самыя прыемныя рэчы. Аднак ён прывык не звяртаць на гэта ўвагі, бо «сябры і знаёмыя ведаюць, які я, а астатняе мяне не датычыцца».*

*Рэальны Юра Дземідовіч марыць стаць выдатным музыкам, павучыцца сваёй прафесіі ў іншых краінах і пасля выконваць такую музыку, якую можна будзе назваць высокім мастацтвам. А яшчэ Юра — гэта звычайны хлопчык, які пасля інтэрв'ю ідзе гуляць у «мокрую вайну» ля фантана, а на наступны дзень збіраецца пускаць мыльныя бурбалкі ў парку. На ўсе мае пытанні ён адказвае ўзважана і спакойна:*

**— Юра, як пажывае той самы «Чароўны трусік», якога ты прыдумаў і ажывіў тры гады таму?**

— Як пажывае? Я не выконваю яго ўжо год, нават больш. Паколькі была зроблена афіцыйная заява, што я яго больш не спяваю.

**— З чым гэта звязана?**

— Трусік-трусікам, але на ім нельга спыняцца, бо гэта не спрыяе развіццю, калі адну песню ўсюды выконваеш. І ў дадатак гэта моцна стамляе. Трэба заўсёды рухацца наперад, ісці далей і імкнуцца штосьці новае вынаходзіць, укладаць у музыку.

**— Ці складана было справіцца з той славай, якая абрынулася на цябе пасля дзіцячага «Еўрабачання»?**

— Насамрэч я пра гэта нават не думаў. Па-першае, я веруючы чалавек, і мая сям'я веруючая. Па-другое, мне было неяк не да таго, бо ёсць больш важныя мэты ў жыцці. Музыка мне вельмі падабаецца, я ўвесь аддаюся гэтаму і хачу звязаць з ёй сваё жыццё. Таму папулярнасць і слава — гэта прыемна, але я не імкнуся быць самым папулярным і вядомым. Мая мэта ў музыцы вышэй за гэта. Я не хачу быць проста вядомым, адпавядаць уяўленням многіх, быццам гэта крута. Насамрэч, калі табе падабаецца справа і ты ёй аддаешся, то ўсё атрымаецца.

**— Ці паўплываў конкурс на тваё жыццё, ці стала больш выступленняў?**

— Натуральна, ладзіцца больш канцэртаў і я атрымліваю больш запрашэнняў — адразу мела, гэта ж «Еўрабачанне».

**— Сёлета ты паступаеш у музычны каледж пры Беларускай акадэміі музыкі. На якую спецыяльнасць?**

— Харавое дырыжыраванне.

**— Ты хочаш быць дырыжорам?!**

— На харавым дырыжыраванні ёсць урок пастаноўкі голасу. А асобнай спецыяльнасці «Вакальнае мастацтва» ў нашым каледжы няма. Калі я выпушчуся і атрымаю дыплом, то змагу быць канцэртмайстрам, кіраўніком хору, быць спеваком, магу далей ісці куды заўгодна. Мне вельмі падабаецца харавое дырыжыраванне — гэта класна, гэта па мне.

**(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)**

Час «Х»

# АДСТУПАЦЬ ПОЗНА — ВАС РАЗМЕРКАВАЛІ!


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**У жніўні для большасці выпускнікоў ВНУ настае час «Х»: з учарашніх студэнтаў яны перакваліфікуюцца ў маладых спецыялістаў. Безумоўна, ад таго, як яны правядуць два бліжэйшыя гады, ці набяруцца прафесійнага досведу, будзе залежыць у іх далейшай прафесійнай кар'еры вельмі многае. Аднак не сакрэт, што да маладых кадраў на некаторых прадпрыемствах і ў арганізацыях ставяцца без асаблівага энтузіязму. Маладых трэба вучыць, і нават калі тыя не задавальняюць свайго наймальніка, у апошняга няма ніякай законнай магчымасці ўзяць на іх месца больш вопытных спецыялістаў. Накіраванне ў размеркаваных выпускнікоў ужо на руках, таму і ім, і наймальнікам адступаць позна.**

### Такія важныя нюансы

— Два гады работы па размеркаванні трэба правесці з максімальнай карысцю для сябе, — раіць **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.** — Таму яшчэ пры працаўладкаванні трэба звярнуць увагу літаральна на ўсе «нюансы». Па-першае, прыйсці да наймальніка вы павінны **да таго дня, які ўказаны ў вашым накіраванні**. І калі там напісана, што вы павінны прыбыць да 1 жніўня, а вы раптам вырашыце адкласці свой візіт на 5 жніўня, то за гэты час наймальнік ужо паспее адправіць паведамленне ў вашу ВНУ, дзе будзе запісана, што малады спецыяліст па месцы размеркавання не з'явіўся. І калі вы не зможаце даказаць камісіі па размеркаванні, што ў вас былі на тое ўважлівыя прычыны, то з вас маюць права спагнаць грошы за ўсе гады вашага бюджэтнага навучання.

Пры працаўладкаванні з вамі будзе заключацца або **кантракт**, або **працоўны дагавор** на няпэўны тэрмін. Розніца паміж гэтымі двума дакументамі вельмі істотная. Заключэнне працоўнага дагавора на няпэўны тэрмін азначае, што вы атрымліваеце не толькі месца працы на два бліжэйшыя гады, але і пасля заканчэння работы па размеркаванні зможаце застацца працаваць у гэтай арганізацыі або на прадпрыемстве (вядома, калі будзе на тое жаданне). Для таго, каб скасаваць працоўны дагавор без жадання работніка, патрабуюцца надзвычай сур'ёзныя прычыны: наймальніку давядзецца даказаць, што яго работнік — прагульшчык, парушальнік працоўнай дысцыпліны або п'яніца. А вось кантракт з вамі могуць проста не падоўжыць без тлумачэння прычын.

Калі ў вас няма працоўнай кніжкі, то яна павінна быць выпісана вам на працягу пяці дзён. І ў працоўнай кніжцы вы знойдзеце запіс аб гадах вашага навучання. Вучоба залічваецца работніку ў агульны працоўны стаж пры налічэнні пенсіі, таму лепш займець гэты запіс своечасова.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

Ведай нашых!

## СТУДЭНТЫ-ПРАГРАМІСТЫ ПАЦВЯРДЖАЮЦЬ «ВЫСОКІ КЛАС»

**Каманда студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі ўпершыню перамагла ў VII міжнароднай студэнцкай адкрытай алімпіядзе па праграмаванні KPI-OPEN 2012.**

Алімпіяда праходзіла ў Кіеве на базе Нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і кібернетычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Украіны. Сёлета ўдзел у ёй узялі 77 каманд з Расіі, Беларусі, Венгрыі, Малдовы, Польшчы, Украіны і Чэхіі. За сем гадоў правядзення алімпіяды яна пераўтварылася ў найбуйнейшыя спаборніцтвы па праграмаванні сярод студэнтаў краін Усходняй Еўропы і СНД.

Па правілах спаборніцтваў, усяго прысуджаецца 6 прызавых месцаў: адно — першае, два другія і тры трэція. Перамогу святкавалі ў Кіеве студэнты факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Аляксей Ропан, Ігар Брукаў і Данііл Беражной. Зусім нядаўна, у маі, гэтая ж тройка заваявала бронзавы медаль на чэмпіянаце свету па праграмаванні сярод студэнтаў у Варшаве.

Па словах кіраўніка каманды, намесніка дэкана факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Аляксея Ляшчова, перамога беларускіх студэнтаў на KPI-OPEN 2012 у чарговы раз прадэманстравала высокі ўзровень падрыхтоўкі айчынных праграмістаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
19 07 2012 г.

# АДСТУПАЦЬ ПОЗНА — ВАС РАЗМЕРКАВАЛІ!




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Давярай, але правярай!

— Перш чым падпісваць кантракт або працоўны дагавор з наймальнікам, трэба спачатку дамовіцца з ім аб умовах вашай працы, якія затым будуць занатаваны ў кантракце або дагаворы. Гэта меры матэрыяльнага стымулявання, вашы абавязкі і абавязкі наймальніка, — папярэджвае Ларыса Манюк. — Дапусцім, вам скажуць, што ваша пасада пакуль занятая, таму на паўгода-год вам прапануецца іншая. Але няма нічога больш пастаяннага, чым часовае... Думайце, ці патрэбна вам працаваць не па сваёй спецыяльнасці, бо, калі вы пажадаеце змяніць месца працы праз два гады, высветліцца, што ў вас няма стажу работы па атрыманай у ВНУ спецыяльнасці. Ці, напрыклад, вам могуць прапанаваць ніжэйшую пасаду ды яшчэ сказаць, што калі вы не пагаджаецеся, то яны вас не возьмуць на працу і вы будзеце вымушаны вяртаць дзяржаве грошы за ўсе гады свайго навучання... Майце на ўвазе, што наймальнік проста абавязаны прадаставіць маладому спецыялісту працу па той спецыяльнасці, якая запісана ў яго накіраванні. Перш чым падпісваць дакумент, які выклікае ў вас сумненні, лепш параіцца з юрыстам, каб дакладна ведаць, што цябе чакае наперадзе, — гэта права любога чалавека.

**На працягу двух гадоў пасля заканчэння ВНУ іх выпускнікі, якія прыступілі да працы па размеркаванні і з'яўляюцца маладымі спецыялістамі, абавязаны паведамляць у камісію па размеркаванні аб усіх змяненнях, звязаных з іх вучобай і работай. А ўстанова адукацыі абавязана адсочваць усе іх перамяшчэнні.**

Калі наймальнік адмаўляе маладому спецыялісту ў працаўладкаванні (а такое можа здарыцца, напрыклад, з-за змены штатнага раскладу), неабходна атрымаць у наймальніка пісьмовае тлумачэнне, дзе будзе пазначана, па якой прычыне працаўладкаванне маладога спецыяліста немагчымае. З гэтай паперай трэба вярнуцца ў ВНУ і папрасіць аб пераразмеркаванні. Калі па адпаведнай спецыяльнасці ў навучальнай установе засталіся незадаволеныя заяўкі, маладога спецыяліста накіруюць на новае месца працы. А калі такіх няма, выдадуць даведку аб праве самастойнага працаўладкавання. Магчыма і пераразмеркаванне па персанальным запыце.

## Чытайце з лупай!

Яшчэ на стадыі працаўладкавання маладога спецыяліста павінны азнаёміць з унутраным распарадкам і калектыўным дагаворам. Іх таксама раю ўважліва чытаць, паколькі ў калектыўным дагаворы могуць быць прапісаны матэрыяльныя выгады, на якія вы зможаце прэтэндаваць, а ў правілах унутранага распарадку можа быць занатавана, напрыклад, забарона на курэнне, якая дзейнічае на тэрыторыі прадпрыемства або арганізацыі, ці нейкая іншая важная для вас інфармацыя.

Ларыса Манюк расказала, як аднойчы ў прафсаюз звярнулася будучая настаўніца. Дзяўчына 16 жніўня прыйшла ў школу, куды была размеркавана, і там раптам высветлілася, што ў школе — новы дырэктар, які ўзяў на працу іншага спецыяліста, паколькі пра накіраванне выпускніцы ВНУ нічога не ведаў. Сталі разбірацца: дзяўчына яшчэ ў ліпені прыйшла на месца сваёй будучай работы, напісала заяву, і дырэктар ёй сказаў выходзіць на працу пасля 15 жніўня. Аднак заяву выпускніцы дырэктар у аддзел кадраў не аднёс, а сам звольніўся.

Таму, каб вас не абвінавацілі ў тым, што вы несвоечасова з'явіліся на месца размеркавання (асабліва гэта датычыцца будучых настаўнікаў, у якіх адпачынак пасля заканчэння ВНУ — больш працяглы), як толькі дырэктар падпісаў з вамі кантракт або працоўны дагавор, тут жа нясіце яго ў «кадры».

Нярэдка выпускнікоў ВНУ цікавіць: а ці можа малады спецыяліст працаваць на палову стаўкі? Па словах Ларысы Манюк, у адпаведнасці з артыкулам 118 Працоўнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь, па згодзе паміж наймальнікам і работнікам апошняму можа быць устаноўлены няпоўны працоўны дзень.

— Нідзе не прапісана, што малады спецыяліст павінен працаваць менавіта на стаўку. Але калі сам наймальнік прапануе вам работу на няпоўную стаўку, то трэба сто раз падумаць, чым даць на гэта згоду, — падкрэсліла спецыяліст. — І ні ў якім разе не пагаджайцеся афармляцца на месца работніка, які знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, таму што гэты работнік можа выйсці на працу ў любы момант...

## Аб прывілеях

**Самая галоўная прывілея — абарона ад звальнення на працягу двух гадоў. Маладым спецыялістам не ўстанаўліваецца выпрабавальны тэрмін. Наймальнік не можа звольніць маладога спецыяліста на аснове такой фармулёўкі, як «неадпаведнасць займаемай пасадзе ці выконваемай рабоце па прычыне недастатковай кваліфікацыі».**

**Калі студэнт больш за 50% тэрміну вучыўся за кошт бюджэтных сродкаў, а потым перавёўся на платнае завочнае аддзяленне, то ён таксама падпадае пад размеркаванне, за выключэннем выпадку, калі ён ужо працуе па спецыяльнасці.**

Выпускнікі, якія працуюць не па месцы жыхарства бацькоў у бюджэтных арганізацыях, маюць права на атрыманне льготнага крэдыту для набыцця рэчаў першай неабходнасці. А вось прадастаўленне жылля па месцы размеркавання, на жаль, заканадаўства не гарантуе. Умова аб выдзяленні маладым спецыялістам жылога памяшкання наймальнікам можа быць агаворана ў накіраванні на працу і працоўным дагаворы (кантракце). Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама арганізацыі пры недастатковасці ўласнага жыллёвага фонду могуць выдзяляць сродкі з мэтай кампенсацыі выдаткаў на найм жылля, але гэта іх права, а не абавязак.

**Падставай для пераразмеркавання маладога спецыяліста могуць быць: медыцынскія супрацьпаказанні да работы па атрыманай спецыяльнасці; адмова наймальніка ў прыёме на працу маладому спецыялісту, накіраванаму ў адпаведнасці з заяўкай гэтага наймальніка; немагчымасць забеспячэння месцам працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй пасля заканчэння службы ва Узброеных Сілах; скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка ў выпадку ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэння колькасці і штату работнікаў; перавод маладога спецыяліста з яго згоды ад аднаго наймальніка да іншага і г.д.**

## Лепш без перапынку

**А што рабіць, калі выпускнік быў размеркаваны, але хоча прадоўжыць сваё навучанне на больш высокай ступені ці адпрацаваў год па размеркаванні, але жадае паступіць у магістратуру?**

— Лепш за ўсё не рабіць перапынкаў паміж навучаннем і паступаць, напрыклад, у магістратуру ў год заканчэння навучання на першай ступені вышэйшай школы, — раіць **намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА**.

Калі малады чалавек закончыў навучанне ў 2010 годзе, адпрацаваў адзін год і паступіў у магістратуру ў 2011 годзе, то незалежна ад таго, навучаўся ён у магістратуры за кошт уласных сродкаў або бюджэтных, ён абавязаны адпрацаваць па размеркаванні яшчэ адзін год. А калі работа па размеркаванні не ўваходзіць у яго жыццёвыя планы, то яму давядзецца расплачвацца з дзяржавай. У тым выпадку, калі малады спецыяліст не прыступіў да працы ці звольніўся да заканчэння тэрміну абавязковай адпрацоўкі і не жадае вяртаць у бюджэт сродкі ў добраахвотным парадку, грошы будуць спаганяцца з яго ў судовым парадку...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

## Адпачнем ад урокаў... яшчэ два дні

Вучэбныя заняткі ў школах распачнуцца сёлета не як звычайна — 1 верасня, паколькі гэты дзень прыпадае на суботу, а ў панядзелак — 3 верасня. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі. Першая вучэбная чвэрць будзе доўжыцца з 3 верасня па 31 кастрычніка 2012 года. Другая — з 8 лістапада па 24 снежня. Трэцяя — з 9 студзеня па 22 сакавіка і чацвёртая — з 1 красавіка па 31 мая 2013 года. Такім чынам, працягласць восеньскіх школьных канікул складзе 7 дзён (з 1 па 7 лістапада), зімовых — 15 дзён (з 25 снежня па 8 студзеня). Вясной дзеці будуць адпачываць ад урокаў 9 дзён — з 23 па 31 сакавіка. Але для навучэнцаў I і II класаў у трэцяй чвэрці арганізуюцца дадатковыя канікулы працягласцю адзін тыдзень — гэта трэці тыдзень лютага.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Усё — для школы, усё — для дзетак

**Традыцыйна з сярэдзіны ліпеня ва ўсіх абласцях і ў сталіцы пачынаецца пашыраны продаж тавараў для навучэнцаў, праводзяцца выставы, дэманстрацыі, акцыі і іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на задавальненне попыту ў рэчах школьнага асартыменту да новага навучальнага года.**

Паводле інфармацыі Мінгандлю, на пачатак месяца ад асноўных пастаўшчыкоў, прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам», ужо паступіла ў гандлёвую сетку каля 70 працэнтаў тэкстыльнага адзення дзелавога стылю ад узгодненых на чэрвень—жнівень аб'ёмаў, каля 30 працэнтаў трыкатажных і скургалантарэйных вырабаў, абутку.

Усяго ў перыяд падрыхтоўкі да новага навучальнага года ў краіне будуць працаваць больш за 200 пастаянна дзеючых школьных кірмашоў, на якіх будзе прадстаўлены асартымент адзення, абутку і школьна-пісьмовых прылад. Дадаткова арганізуецца таксама правядзенне 590 школьных кірмашоў у выхадныя дні. Гэтыя мерапрыемствы будуць суправаджацца рознымі рэкламнымі акцыямі: забаўляльнымі праграмамі для дзяцей, розыгрышамі латарэй.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Ведай нашых!*

## ВЫСТУПІЛІ БЕЗ «ХАЛАСТЫХ ВЫСТРАЛАЎ»

**У Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе, якая завяршылася днямі ў Аргенціне, узялі ўдзел шэсць беларускіх школьнікаў. Дамоў яны прывезлі 5 медалёў.**

З сярэбранай узнагародай вярнуліся на радзіму дзевяцікласнік сталічнай сярэдняй школы № 41 Дзмітрый Баброў, навучэнцы 10 класа той жа школы Арцём Жук і Аляксей Семчанкаў, а таксама адзінаццацікласніца СШ № 41 Настасся Танана. «Бронза» — у прадстаўніцы Ліцэя БДУ Марыі Манкевіч. Яшчэ адзін удзельнік беларускай каманды — ліцэіст БДУ Сцяпан Дабрынеўскі — атрымаў на алімпіядзе пахвальную грамату.

Традыцыйна беларуская зборная фарміруецца з пераможцаў рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы. На спецыяльных зборах, якія праводзяцца ў два-тры этапы, выбіраюць лепшых з лепшых — тых, хто ў выніку і прадставіць Беларусь на Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе. Сёлета прадстаўнікі сталічнай школы № 41, якая ў новым навучальным годзе будзе працаваць у статусе гімназіі, выступілі на алімпіядзе проста бліскуча. У неафіцыйным рэйтынгу сярод 100 краін-удзельніц Беларусь уваходзіць па сваіх выніках у дваццатку лепшых.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Дабрачыннасць нон-стоп*

# СУПРАЦЬСТАЯЦЬ... РЭАЛЬНАСЦІ

**Памятаеце прыпавесць, калі адзін чалавек вырашыў праверыць мудраца. Ён злавіў матылька ў далоні і запытаўся: «Жывы гэты матылёк ці мёртвы?» На што мудрэц адказаў: «Усё ў тваіх руках». Жыццё непадказальнае ў сваіх праявах справядлівасці, дабра ці зла. Але ў самых складаных, здавалася б, невырашальных сітуацыях чалавек спадзяецца на цуд. Ніколі не ведаеш, адкуль яго чакаць. Застаецца верыць і... супрацьстаяць рэальнасці.**



Амаль паўгода стараюцца верыць у лепшае ў сям'і Паўла Малашэвіча. З маладым чалавекам у студзені гэтага года здарылася бяда. Павел атрымаў вытворчую траўму, упаўшы ў вентыляцыйную прабоіну. Страціў прытомнасць, быў у коме. Адразу пасля няшчаснага выпадку Паўла прывезлі ў Мінскую абласную бальніцу, што ў Бараўлянах. «Адмераны» яму адрэзак жыцця вымяраўся хвілінамі. Надзеі ніхто не даваў.

— Тры месяцы Павел ляжаў у рэанімацыі. Да яго нас не пускалі. Толькі калі вельмі прасіліся, і тое не больш, чым на гадзіну, — расказвае Марыя, жонка Паўла Малашэвіча. — У выніку ў яго ўтварыліся пролежні, хоць нам казалі, што ўсё на стадыі загойвання. Яшчэ адзін момант: Пашу кармілі праз зонд і прабілі яму стрававод. Таму цяпер яго нельга нават карміць нармальна, бо ежа ці вада могуць трапіць у дыхальныя шляхі. Патрэбна вельмі складаная аперацыя, і невядома, як яна можа скончыцца. Пагроза для жыцця застаецца.

Сёння Паўла перавялі ў 10-ю клінічную бальніцу Мінска, дзе каля яго круглясутачна папераменна знаходзяцца маці і жонка. Працэс рэабілітацыі, можа, і не зацягнуўся б настолькі, калі б не розныя ўскладненні. Сям'я не здаецца, кожны дзень змагаецца за роднага чалавека. За паўтара месяца ён ужо прыстасаваўся сядзець. Пачалі распрацоўваць рукі, ногі, маторыку, міміку.

— Усяму вучымся. Бо калі не мы, то... ніхто, — кажа Маша. — Я ўжо згубілася ў часе. Хацелася б прачнуцца і зразумець, што гэта проста страшны сон.

Сябры, знаёмыя і людзі, неабыякавыя да чужога гора, падтрымліваюць сям'ю Малашэвічаў. Тэлефануюць, каб пацікавіцца станам Паўла, збіраюць і перадаюць грашовыя сродкі на лячэнне і рэабілітацыю. Не засталася ў баку і моладзь Узденшчыны. І на іх заклік адгукнуліся ўдзельнікі валанцёрскага руху БРСМ «Добрае сэрца». Яны і арганізавалі дабрачынны канцэрт, а ўсе сабраныя сродкі з яго былі адрасна накіраваны на лячэнне Паўла.

Павел ужо пачаў размаўляць. Можна з ім пагаварыць, нават параіцца. Паша трымаецца. Яго галоўны стымул — дачка Насця, якой нядаўна споўніўся год і месяц. А калі ёсць стымул — трэба спадзявацца на вынік.

Гэтая гісторыя — толькі частка «мазаікі» лёсаў тых людзей, да бяды якіх Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі прыцягнуў увагу грамадскасці. Дабрачынны нон-стоп марафон «Усе фарбы жыцця для цябе» — сёння ўжо візітная картка Мінскай абласной арганізацыі БРСМ. Праект заснаваны на прынцыпе зямляцтва. Кожны раз у падтрымку цяжка хворых дзяцей арганізоўваюць і праводзяць дабрачынныя канцэрты ў іх родным горадзе. А пачыналася ўсё з гісторыі Лізы Мароз. Дзяўчынцы на той час было 9 гадоў, і ёй патрэбна была аперацыя па перасадцы ныркі. Спачатку не ведалі, што рабіць і як дапамагчы. Паспрабавалі арганізаваць канцэрт. Рабілі гэта ўпершыню, але ўсё атрымалася. Запрасілі артыстаў, і ніхто з іх не адмовіўся... Сума па тых часах была сабрана невялікая, але гэта выклікала рэакцыю ў грамадстве. Пасля той гісторыі геаграфічна ўдзельнікі дабрачыннага нон-стоп марафона ўжо завіталі ў Капыль, Слуцк, Беразіно, Стоўбцы, Мар'іну Горку і многія іншыя гарады. Для чатырнаццаці гісторый напісалі працяг.

Валанцёрскі рух «Добрае сэрца» развіваецца з 2006 года. Сёння рэальна дзейнічае 101 атрад (да параўнання: у 2009 годзе іх было толькі 23). Валанцёрства — справа дабрачынная, якая залежыць ад асабістых якасцяў кожнага. Ад нараджэння ў нас закладзены імкненне дапамагаць бліжняму, міласэрнасць, спачуванне. І валанцёрскі рух — менавіта тая тэрыторыя, дзе кожны можа знайсці спосаб рэалізаваць свае жаданні, дапамагчы камусьці бескарысна.

— Калі кантактуеш з моладдзю, то бачыш, што расце вельмі цікавае пакаленне. У іх ёсць ген альтруізму, — расказвае каардынатар руху «Добрае сэрца» Мінскай вобласці Наталля Марозава. — У кожнага свой напрамак у залежнасці ад інтарэсаў, «балючых» месцаў. Адны праводзяць акцыі па ахове прыроды, іншыя дапамагаюць адзінокім бабулям і дзядулям, нехта падтрымлівае дзяцей-інвалідаў. Усе яны добра разумеюць эфект жыццёвага бумерангу, дзе зробленае аднойчы вяртаецца. Мы жывём пад дэвізам: няхай расце кола людзей, аб'яднаных не толькі жаданнем рабіць добра, але і даказваць гэта справай.

***Той, хто захоча падтрымаць сям'ю Малашэвічаў, можа гэта зрабіць, пералічыўшы грошы на рахунак: № 01044656, Філіял/аддзяленне 529/78 ААТ «ААБ Беларусбанк», Малашэвіч Таццяне Мікалаеўне (на лячэнне і рэабілітацыю сына Паўла).***

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з архіва Наталлі Марозавай.**

*Ведай нашых!*

# ЁН СЕЎ НА МАТАЦЫКЛ У ЧАТЫРЫ ГАДЫ

**Нядаўна ў спартыўным жыцці Беларусі адбылася яркая падзея, якую запісалі залатымі літарамі ў гісторыю ДТСААФ. Наш спартсмен, майстар спорту міжнароднага класа Яўген Тылецкі, упэўнена перамог на нялёгкім васьміэтапным чэмпіянаце Еўропы па мотакросе ў класе «EMX Open». Гэта сапраўды выдатнае дасягненне выхаванца спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўна-тэхнічнай школы па аўтамотаспорце ДТСААФ. Падобнага поспеху ў гісторыі айчыннага мотакросу яшчэ не дасягаў ніхто.**



Яўген Тылецкі — спартсмен, які пастаянна прагрэсуе і ніколі не спыняецца на дасягнутым. Летась ён стаў сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы па мотакросе. Да вышэйшай прыступкі п'едэстала Яўгену не хапіла літаральна некалькі балаў. Тады яго апярэдзіў тытулаваны чэх Петр Барташ. А сёлета Тылецкаму не было роўных!

...З дзяцінства спартыўная кар'ера Яўгена Тылецкага развівалася даволі імкліва. Ужо ў 13 гадоў Яўген трапіў у дарослую зборную Беларусі, з якой удзельнічаў у «Трафеі нацый» — камандным чэмпіянаце свету. У гэтым узросце ён выканаў нарматыў майстра спорту. А ў 17 Тылецкі стаў прызёрам чэмпіянату свету і Еўропы. Пэўны час выступаў нават за прафесійную нямецкую каманду.

У агульным заліку чэмпіянату Еўропы-2006 Яўген Тылецкі заваяваў трэцяе месца і выканаў нарматыў майстра спорту міжнароднага класа. А ў 2007-м ён заняў 5-е месца ў агульным заліку кантынентальнага першынства ў класе «MX-2 Ynior».

Безумоўна, апавядаючы пра поспехі Яўгена, трэба ўзгадаць пра яго бацьку — выдатнага дтсаафаўскага спартсмена, майстра спорту СССР па мотакросе, шматразовага чэмпіёна Савецкага Саюза і БССР Аляксандра Васільевіча Тылецкага. На жаль, ён зарана пайшоў з жыцця, але паспеў выгадаваць дастойнага сына, здолеў закласці ў Яўгена байцоўскі характар, працалюбства, вялікую адданасць матаспорту, навучыў яго быць сапраўдным патрыётам.

Яўген самастойна сеў на спартыўны матацыкл і пераадолеў першыя кіламетры, калі яму ледзь споўнілася чатыры гады. Адметна, што трэнерскую эстафету Тылецкага-старэйшага па падрыхтоўцы сапраўднага чэмпіёна ў свой час прыняў сябра Аляксандра Васільевіча — вядомы матакрасмен Уладзімір Стральчэня. У пэўным сэнсе яму прыйшлося стаць другім бацькам для Яўгена, усяляк дапамагаць яму і ў спорце, і ў жыцці. Таму перамога на кантынентальным першынстве Яўгена — у поўнай меры і вікторыя Уладзіміра Стральчэні, а таксама ўсяго трэнерскага штаба.

Своеасаблівым хросным бацькам Яўгену шмат гадоў таму стаў іншы знакаміты спартсмен, майстар спорту СССР па матаспорце Яўген Паршын, які быў лепшым сябрам Аляксандра Тылецкага. Менавіта ў гонар гэтага цудоўнага чалавека і далі імя Тылецкаму-малодшаму. Сёння Паршын — віцэ-прэзідэнт Расійскай федэрацыі матацыклетнага спорту, і ён пільна сочыць за кар'ерай свайго маладога цёзкі.

Трэба дадаць, што колькі гадоў таму ДТСААФ Беларусі заснаваў і кожны год праводзіць адкрыты турнір памяці Аляксандра Тылецкага па мотакросе ў знак павагі да дасягненняў знакамітага спартсмена. У гэтых прэстыжных спаборніцтвах заўжды ўдзельнічаюць мацнейшыя спартсмены Беларусі і блізкага замежжа. Безумоўна, у турніры памяці бацькі заўсёды імкнецца прымаць удзел Яўген. Для яго гэта добрая падстава распавесці маладым пра Аляксандра Васільевіча і прадэманстраваць майстар-клас на мотакросавай трасе.

**Андрэй ДРОБ, фота аўтара.**

*Ліст у нумар*

# Інструкцыя «Як стаць беларускамоўным»

**Ніколі не забуду, як гады два таму, трапіўшы ў рэканструктарскі рух, упершыню пабачыла беларускамоўную дзяўчыну. Не забуду, як уразіў яе вобраз. Вельмі спадабаўся стыль гаворкі дзяўчыны. Нейкі незвычайны, сучасны.**

З таго моманту я вырашыла размаўляць па-беларуску. Але... саромелася і бянтэжылася. Часта даводзіцца чуць ад людзей, якія таксама не супраць пачаць размаўляць на беларускай мове, штосьці накштальт: «Хочацца размаўляць па-беларуску, але сорамна і страшна. Напэўна, лепш пачынаць размаўляць у сямейным коле...». Узгадваю сябе. Насамрэч, страшна было пачынаць, бо не ведаеш, як адрэагуюць спадарожнікі. Але я пачала размаўляць па-беларуску менавіта ў грамадскай сферы жыцця. Бо з роднымі людзьмі складаней. Бацькі вучылі мяне гаварыць на рускай мове, размаўляць з імі па-беларуску было амаль немагчыма. Таму я пачынала з крам, пошты, білетных кас і г.д. Зараз узгадваю, на што была падобная мая «беларуская» ў той момант. У лепшым выпадку — «трасянка». І надзвычай «затарможаная», бо над словамі думала даволі-такі доўга. Але праз страх за тое, як жа мяне ўспрыме наваколле, я не адчувала страху за недасканаласць мовы.

Жаданнем размаўляць па-беларуску загарэліся і мае сябры. І я ўжо не адчувала сябе самотнай у гэтай справе. Паступова стала адчуваць, што мая беларуская становіцца ўсё лепш і лепш. Але не хапала аднаго — беларускамоўнай камунікацыі. І лёс звёў мяне з маладымі дзяўчатамі і хлопцамі, якія размаўляюць на беларускай мове. Спачатку нас было няшмат. Памятаю, як збіраліся ў маленькім пакойчыку і вывучалі мову з настаўніцай мясцовай гімназіі. Разбіралі новую лексіку, шукалі беларускія адпаведнікі запазычаным словам... Паступова вакол нашага кола пачалі гуртавацца. Прыходзілі і цікаўныя, і людзі «са стажам». Зараз усведамляю, што ў Віцебску, аказваецца, цэлае кола беларускамоўных.

Але, на жаль, сучаснае грамадства не разумее ці проста не хоча разумець прагу да роднага. Былі розныя выпадкі. Ад кпінаў да прынцыповай адмовы прадаць тавар у краме... Нядаўна шпацырую каля ратушы і размаўляю па тэлефоне. Раптам бачу, што са мной параўняўся малады хлопец і глядзіць на мяне здзіўленымі вачыма. І пытаецца: «А на якой мове вы размаўляеце? На польскай? Нешта да беларускай падобна. Нічога не разумею». Калі растлумачыла, у чым справа, хлопец, запытаўся: «А чаму вы размаўляеце па-беларуску?» — «Таму што я жыву ў Беларусі». Звычайна, пачуўшы гэты аргумент, людзі бянтэжацца. Вось так уплывае білінгвізм на самасвядомасць беларусаў.

Кожны чалавек сам выбірае, на якой мове яму думаць, размаўляць, камунікаваць з іншымі людзьмі. Але ведаць родную мову павінен кожны беларус. Зараз у краіне ідзе актыўнае вывучэнне замежных моў. Але мы не ведаем элементарных слоў на роднай мове. Звяртаюся да ўсіх словамі Ф. Багушэвіча: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!» А каб гэта сапраўды не здзейснілася, пачаць павінен кожны з сябе.

Дарэчы, у хуткім часе пасля майго ўваходжання ў кола беларускамоўных, я пазнаёмілася з дзяўчынай, пад уплывам якой пачала размаўляць па-беларуску. Гэта Эла Петрачэнка, настаўніца беларускай мовы і літаратуры, актыўны культурны дзеяч у горадзе. Напэўна, такі лёс.

**Вікторыя ЧАПЛЕВА, выпускніца гімназіі № 5 г. Віцебска.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
19 07 2012 г.

# «ЧАРОЎНЫ ТРУСІК» ПРАЗ ТРЫ ГАДЫ


...тры гады таму.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

**— Зараз ты з'яўляешся салістам капэлы хлопчыкаў. Што гэта за капэла і што ў ёй спяваюць?**

— Капэла — гэта наш хор хлопчыкаў у каледжы. Раней кіраваў ёю Уладзімір Глушакоў, які і рыхтаваў мяне да «Еўрабачання». З яго сынам мы рабілі гэту песню пра трусіка. Цяпер усё ўзначальвае Павел Шэпелеў. Капэла выконвае класічную музыку, духоўную. Спяваем на канцэртах, ездзім па розных краінах.

**— Зараз ты пішаш песні? Пра што яны?**

— На гэты час, калі я пішу песні, то толькі для сябе. Не хачу нічога афішаваць — усё для самазадавальнення, як кажуць.

**— У тваім «Чароўным трусіку» ёсць такія радкі: «Вершы складае, латынь вывучае, на скрыпцы грае, па маме сумуе». Гэта ўсё пра цябе?**

— Калі я некуды з'язджаю, насамрэч, я не адразу пачынаю сумаваць па бацьках, але пасля мне сапраўды моцна іх не хапае. «Латынь вывучае» — я не вывучаю латынь, а толькі іспанскую, англійскую мовы — мне вельмі падабаецца іспанская. На скрыпцы я таксама не іграю, але люблю ўсе струнныя інструменты, асабліва скрыпку, віяланчэль — гэта надта прыгожыя інструменты, у іх выдатны тэмбр.

**— Наколькі блізкія стасункі ты маеш з сям'ёй?**

— У нас выдатныя ўзаемаадносіны, пэўна, як ва ўсіх дзяцей з бацькамі.

**— Чым захапляешся, акрамя музыкі?**

— Мне вельмі падабаецца спорт. Я люблю футбол — я балельшчык клуба «Барселона» і зборнай Іспаніі. Удзельнічаю ў чэмпіянатах па настольным тэнісе. Некалі прафесійна займаўся шахматамі, у мяне 2-1 разрад. Я рознабаковы чалавек: і вялікі тэніс, і шмат што іншае мне даспадобы.

**— Як любіш праводзіць вольны час?**

— Па-рознаму. Люблю плаваць, люблю сустракацца з сябрамі. Я гуляю шмат, або хаця б імкнуся, бо не заўсёды часу хапае.

**— Ты ўдзельнічаў у такім маштабным конкурсе, як дзіцячае «Еўрабачанне». Ці ёсць яшчэ якія-небудзь буйныя праекты, у якіх ты б марыў паспрабаваць сябе?**

— Я пра гэта яшчэ нават не думаю. Я мару быць прафесійным музыкам і атрымаць выдатную адукацыю — там і праекты, і конкурсы будуць. Зараз у мяне ламаецца голас, фарміруецца — гэта называецца мутацыя. Калі ўсё скончыцца, можна будзе думаць, дзе і ў чым удзельнічаць. Зараз хачу закласці фундамент з тэарэтычнага матэрыялу. Надзвычай люблю фартэпіяна, стараюся на ім іграць — ва ўсіх прадметах трэба падтрымліваць пэўны ўзровень. Закласці аснову — гэта вельмі важна. Галоўнае — быць музыкантам. А якім — пасля можна будзе выбіраць.

**— Музыка для цябе — гэта любімая прафесія, як ты кажаш. А ці ёсць нейкія думкі пра тое, каб з яе дапамогай змяніць свет?**

— Наконт змяніць свет, перавярнуць яго дагары нагамі — я пра такое не думаю. Я проста хачу, каб музыка заўсёды заставалася мастацтвам, каб яна была патрэбна людзям. Бо многія зараз адмаўляюцца ад гэтага: яны слухаюць і робяць абсалютную музычную безгустоўшчыну. На маю думку, трэба развіваць у Беларусі высокае музычнае мастацтва. Я лічу, што так павінна быць, і магчыма, у мяне атрымаецца штосьці змяніць у гэтым кірунку.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# ЛЯСНЫ КАНЦЭРТ ДЛЯ ТРЫА

## Этна-гурт «Хорціца» марыць сыграць для Сонца, птушак і дрэў



**Ярамір, лідар «Хорціцы», зарабляе на жыццё, вырабляючы з дрэва табурэтачкі і столікі, а ў вольны час іграе на блок-флейце, барабанах і гітары, піша вершы па-беларуску. У Ярaміра свая філасофія. Менш паказухі, больш душэўнай шчырасці. Ён марыць, напрыклад, пра канцэрт у лесе. Навошта? Пра гэта ён і распавёў нашаму журналісту.**

### КАРАГОД ВАКОЛ СОНЦА

— З чым толькі не асацыюецца «Хорціца»: і з украінскім востравам, дзе жылі казакі, і нават з гарэлкай. Але на самой справе назва гурта паходзіць ад Хорса, славянскага бога Сонца. У іншых народаў яго завуць Харсет. Іншыя значэнні слова — «бляск», «зіхаценне», «ззянне», а таксама «слава», «веліч» і нават «хварна» — асаблівая пазнака багоў, абранасць. Напрошваецца таксама думка пра характэр. Бог Хорс лічыўся клапатлівым дарадцам земляробаў і сялян. Ды і сам быў старанным працаўніком, за што і атрымаў павагу людзей.

### ТУМАН ЯК МУЗЫЧНЫ ІНСТРУМЕНТ

— Музыка ў «Хорціцы» — штосьці паміж славянскім фолкам і этна. Мы спалучаем звычайныя інструменты з прыроднымі гукамі і з'явамі накшталт туману, дажджу, шуму паветра. Творчых планаў шмат: заніцца кельтскай музыкай, запісаць альбом, бо ўжо ёсць больш за 20 песень. У бліжэйшы час, 28 ліпеня, выступаем у Мсціслаўлі, на Рыцарскім фэсце. А 18-19 жніўня ўдзельнічаем у першым фестывалі духоўнай песні «Крылатая душа», які арганізуецца пад Стоўбцамі. Ёсць ідэя зрабіць лясны канцэрт. Замест сцэны, крэслаў і душнага памяшкання — вольнае паветра, сонейка, дрэвы, атмасфера спакою і яднання з прыродай.

### НАРАДЖЭННЕ ІДЭІ

— Пачынаў усё я адзін. Што толькі не спрабаваў: і рок, і готыку. Потым пазнаёміўся з Дзям'янам, які цяпер іграе ў нас на барабанах. Памятаю, неяк сядзелі ў лесе, ігралі, нядрэнна атрымлівалася, вось і вырашылі, чаму б не зрабіць гурт. Пасля пазнаёміліся з дзяўчынай Русай, якую я навучыў іграць на флейце. Так з'явілася трыа. Шчыльна працаваць разам пачалі не адразу, спачатку рабілі невялічкія кампазіцыі. Прыкладна год нідзе не ігралі. Рыхтавалі праграму, каб не сорамна было выйсці. А потым «панеслася»... На жаль, у апошні час рэдка збіраемся разам, часцей я адзін выступаю. У нас вольныя адносіны. Калі нехта не хоча іграць, прымушаць я яго не стану.

### КУПАЛЬСКІ ПРАМЕНЬ І ЧАРОЎНАЯ ЭНЕРГІЯ

— Самыя выдатныя песні з'яўляюцца спантанна і адразу. Сядзім, напрыклад, рэпетуем, размаўляем. Потым усё пераходзіць у імправізацыю, экспромт, музыка ліецца, быццам энергетычная плынь, сама па сабе. Менавіта так на Купалле нарадзілася новая песня — «Прамень», зараз адна з любімых. Частку тэкстаў пішу я, астатнія неяк самі да нас прыходзяць — знаходзім цікавыя вершы ці нехта з паэтаў іх прапануе. Спяваем пра славянскіх багоў і старажытныя абрады, часам гуляючы са схаваным сэнсам і алегорыямі. Напрыклад, хто б мог падумаць, што кампазіцыя з назвай «Туман» на самой справе пра любоў да ўсяго свету. У нашых песнях усё пераплятаецца, як у жыцці.

### АД КАСТАНЭДЫ ДА ФАЛЬКЛОРУ

— Народная творчасць — гэта бяздонны акіян. Калі ўзяць рок ці джаз, там няма такой глыбіні. Мы жывём у славянскім свеце, шануем свае традыцыі. Я лічу, што трэба павышаць цікавасць да іх. Чым я толькі не захапляўся: і халатропнымі штучкамі, і Кастанэдам, усё шукаў нешта сваё. Але потым зразумеў — тое, што трэба, прыйдзе само. Потым прыйшла музыка. Памятаю, калі першы раз пачуў гітару, адразу захацелася навучыцца іграць. Спачатку не было свайго інструмента, браў у сяброў. Але ў галаве засела: трэба вучыцца. Іграў, трэніраваўся вельмі шмат, нават ноччу, засынаючы.

### АЎТОГРАФ ЗА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

— Люблю размаўляць па-беларуску, але не люблю празмерную ўвагі да гэтага. Ёсць яшчэ стэрэатыпы, быццам беларускамоўны чалавек — ці з вёскі, ці мае пэўныя палітычныя перакананні. У жыцці я карыстаюся дзвюма мовамі. А вось песні — іншая справа. Усё больш нараджаецца беларускіх. Мова наша маляўнічая, пластычная, вобразная, вельмі прыгожая. Але я лічу, што кожны мае права выбраць, на якой мове яму размаўляць, не трэба нікога прымушаць. Мы выступалі ва Украіне і ў Расіі, на канцэрт невядомай там «Хорціцы» прыйшло вельмі шмат людзей. У мяне нават аўтограф узялі. Першы раз у жыцці!

### ЭНЕРГІЯ ДЖЫМА МОРЫСАНА

— Музыка з усіх відаў мастацтва самая жывая, яна знаходзіцца па-за часам, не залежыць ад яго. Адзін выдатны музыка, Джым Морысан, сказаў — «Музыка — адзіны сябар». Можа, песімістычна, але ісціна ў гэтым ёсць. Без музыкі было б вельмі сумна. Музыка ўсюды — на зямлі і нават у космасе. Мелодыі вядуць да невядомых нікому рэальнасцяў, як ключы, што адмыкаюць усе дзверы. Музыка — гэта энергія, яркія вобразы, вострыя адчуванні. Музыка можа накіраваць чалавека на сапраўдны ўчынкі.

**Марыя ВОЙЦІК.**

*Абставінам наперакор*

# МОЦНЫМ ДУХАМ — УСЁ ПА СІЛАХ



**Гаворка пойдзе пра сельскага настаўніка з вёскі Медна Брэсцкага раёна Мікалая Апановіча. Выкладаць грамадазнаўства ў школе ён пачаў у верасні 2006 года. А ўнікальнасць Мікалая ў тым, што ён усё можа зрабіць, абапіраючыся на слых, нюх, розум і вынаходлівасць, але, на жаль, не на свой зрок.**

Слепата прыйшла, калі хлопцу было чатырнаццаць — знянацку, як ноч для вандроўніка. Але свой шлях наперад Мікалай не пераставаў працягваць. Ён здолеў пры падтрымцы сям'і скончыць з залатым медалём сярэднюю школу ў вёсцы Медна. Свой атэстат, на жаль, убачыць не змог, затое працягваў дэманстраваць веды — ужо перад выкладчыкамі ВНУ. Дзякуючы вынаходлівасці, пазітыўнаму стаўленню да жыцця і людзей, скончыў з чырвоным дыпломам гістарычны факультэт БрДУ імя Пушкіна. Спачатку запісваў лекцыі на дыктафон, а пазней авалодаў камп'ютарнымі тэхналогіямі, што вельмі дапамагала ў навучальным працэсе. Кемлівасць і добрая памяць кампенсавалі адсутнасць зроку. Паралельна з гістарычнай ён атрымаў яшчэ адну адукацыю на факультэце бізнесу і інфармацыйных тэхналогій БДУ. І цяпер яго лепшыя памочнікі — камп'ютар са спецыяльнай праграмай для невідушчых і многафункцыянальны мабільны тэлефон.

Мікалай — чалавек адукаваны, разумны і кантактны. Выпускнік двух факультэтаў універсітэта з чырвоным дыпломам — жаданы госць у любой навучальнай установе. Але сапраўдную падтрымку невідушчы настаўнік змог атрымаць толькі ў роднай школе. Сённяшнія калегі — яго былыя настаўнікі. Насамрэч, прызнаецца Мікалай, прыйшлося пабегаць па інстанцыях, каб даказаць сваю працаздольнасць.Першая група інваліднасці лічыцца непрацаздольнай. Адразу, як даведаюцца, даюць ад варот паварот. Таму і заключэнні медыцынскія прыйшлося збіраць доўга, камісіі праходзіў. Але калі чагосьці вельмі хочаш, усё абавязкова атрымаецца. Сам Мікалай гаворыць: «Хто хоча, той шукае магчымасці, а хто не хоча — прычыны». Ва ўсіх людзей абавязкова ёсць вызначаныя мэты. Іх у Мікалая шмат. І ён зразумеў, пакуль імкнуўся іх ажыццявіць, што мэта не даецца без сілы на яе ажыццяўленне.

## Душа кампаніі

Мікалай насамрэч вельмі дзейны і таленавіты чалавек. Кожны год, напрыклад, імкнецца паўдзельнічаць у турыстычных зборах ад Мяднянскай школы, у інтэлектуальных гульнях. Часам стваpаецца ўражанне, што скарбніца яго ведаў бязмежная па аб'ёме і бяздонная па глыбіні. Ужо восем гадоў ён удзельнічае ў інтэлектуальных спаборніцтвах паміж інвалідамі па зроку. Брэйн-рынг «Эрудыт» збірае самых дасведчаных з усёй вобласці. Пытанні трапляюцца разнастайныя: па гісторыі, літаратуры, філасофіі і прыродазнаўстве. Такія спаборніцтвы для Мікалая — гэта і адрэналін, і канкурэнцыя, і магчымасць праявіць сябе. Сёлета хуткія і дакладныя яго адказы на абласным спаборніцтве прынеслі камандзе першае месца, а сам ён быў прызнаны лепшым гульцом. Падчас падрыхтоўкі Мікалай карыстаецца энцыклапедычнымі звесткамі, электроннымі бібліятэкамі, якія маюць спецыяльную праграму агучвання. Таксама вельмі дапамагае яму мабільны тэлефон з выхадам у інтэрнэт. Карацей кажучы, інфармацыю ёсць дзе знайсці — было б толькі жаданне. Дарэчы, брэйн-рынг стаў для Мікалая Апановіча не толькі гульнёй, але і лёсам: тут шэсць гадоў таму ён пазнаёміўся са сваёй жонкай Таццянай. Вось так і атрымалася шчаслівая сям'я.

## Шчаслівы выпадак

Мікалаю і Таццяне дапамог сустрэцца цікавы выпадак. Адбылося гэта падчас конкурсу эрудытаў у абласным аддзяленні Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. Тады каманда, у якой удзельнічаў Мікалай, разлічвала на першае месца, але па нейкіх прычынах не атрымалася, як планавалі. З таго моманту родныя і знаёмыя, бывае, жартуюць: маўляў, Таня вывела са строю галоўнага гульца. Потым яны практычна кожны дзень тэлефанавалі адно аднаму, выкарыстоўваючы мабільную сувязь. Таня жыла ў Драгічыне, які знаходзіцца за некалькі кіламетраў на ўсход ад Брэста. Таму часта сустракацца не атрымоўвалася. Здаралася, што па тэлефоне гаварылі па дзве-тры гадзіны не перарываючыся. І так... на працягу двух гадоў.

На жаль, у Тані таксама праблемы са зрокам. Яшчэ сямігадовай дзяўчынкай яна нечакана страціла яго. На працягу двух тыдняў зрок аднавіўся. Але потым пачаўся незваротны працэс. У 16 гадоў Таццяна цалкам страціла магчымасць бачыць. Нягледзячы на гэта, душа цягнулася да душы, і, нарэшце, яны адно аднаго знайшлі. Усё адбылося як у добрай казцы. Засталося толькі «жыцьпажываць і дабро наживаць».

## Сола пад гітару

Дзякуючы свайму інтэлектуальнаму ўзроўню Мікалай удзельнічае і ў падрыхтоўцы школьнай каманды «Што? Дзе? Калі?». Сёлета яна заняла 2-е месца на раённым конкурсе. Акрамя таго, часу хапае на гурток «Юны гітарыст». Пятнаццаць вучняў малодшага, сярэдняга і старэйшага ўзросту з задавальненнем пераймаюць у Мікалая вопыт па асваенні музычнага інструмента. Аднак гэтым дзейнасць настаўніка не абмяжоўваецца. Акрамя таго, ён выкладае грамадазнаўства ў 9-11 класах Мяднянскай школы і вядзе факультатыў па гісторыі, заўсёды імкнецца дапамагаць у падрыхтоўцы школьных вечарын, і тэхніка яго слухаецца. Гэтак жа нельга не адзначыць яго дзейнасць у школьным музычным калектыве «Заўзулэнька». У Мікалая выдатны голас: яго сола часта можна пачуць не толькі пад уласную ігру на гітары, але і пад гармонік.

Вучні любяць свайго настаўніка. Ён можа і дысцыпліну на ўроках трымаць, і цікавым матэрыялам юнацкія галовы захапіць. У кожным класе ў яго ёсць памочнік, якому ён даверае запаўняць журнал і выстаўляць адзнакі.

Для чалавека, абмежаванага ў фізічным плане, Мікалай многага дабіўся. Ён смела бярэцца за замежныя мовы — а яны ж не ўсім даюцца з лёгкасцю. Ён жа, акрамя, зразумела, рускай і беларускай, ведае англійскую і нямецкую. У бліжэйшы час збіраецца браца за кітайскую... Мікалай часам паспявае больш, чым чалавек, які бачыць: працоўныя абавязкі, хатнія клопаты, любімыя заняткі. Зрэшты, усё не так і проста, складанасцяў хапае. Але ж жыццё кожнаму дорыць свае сюрпрызы і расчараванні. Гэтак жа, як і свой шанц!

**Ганна БУРАК.**

# ЗА ЗДАРОВЫ АЎТАМАБІЛЬНЫ РУХ

**У Чэрыкаўскім раёне адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, якое павінна быць урокам для многіх аўтамабілістаў. Вадзіцелю стала млосна, але ён рушыў далей і трапіў у аварыю, у выніку якой пацярпелі жанчына і двое малых дзетак.**

У нядзелю ўвечары 28-гадовы жыхар Магілёва, які кіраваў аўтамабілем «Аўдзі-100», адчуў сябе дрэнна: у яго павялічыўся крывяны ціск. Ён спыніўся на абочыне, выклікаў медыцынскую дапамогу. Медыкі прыехалі і зрабілі неабходныя захады, але парадзілі мужчыну не рухацца, пакуль не падзейнічаюць лекі і не палепшыцца самаадчуванне. Аднак вадзіцель крануўся з месца адразу пасля ад'езду «хуткай». У выніку ён страціў кантроль над аўтамабілем, які з'ехаў у кювет і ўдарыўся ў дрэва.

— Безадказнае стаўленне вадзіцеля да ўласнага здароўя прывяло да траўмавання траіх яго пасажыраў: 24-гадовай жанчыны і дваіх дзяцей — 5 гадоў і 11 месяцаў, — пракаментавала інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды Магілёўскай ДАІ Таццяна Старасотнікава. — Чалавек, які кіруе аўтамабілем, павінен адказваць не толькі за сваё жыццё і здароўе, але і за сваіх пасажыраў. Секундная страта пільнасці на дарозе можа стаць прычынай страшных наступстваў.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Нашчшыны :)*

# ТАКІХ НЕ ГЛЯДЗЯЦЬ У НІДЭРЛАНДАХ

**На ўсёй тэрыторыі Галандыі забаронены для трансляцыі ў эфіры і распаўсюджванні на фізічных носьбітах дзіцячы фільм «Дзяўчынка з будучыні». Гэта гучала б смешна, калі б не было сумнай праўдай. Днямі суд Амстэрдама задаволіў іск міжнароднай праваабарончай арганізацыі «Human Rights Watch», прадстаўнікі якой палічылі, што вышэйназваны дзіцячы фільм прапагандуе — увага! — дыскрымінацыю на падставе сэксуальнай арыентацыі!**

У якасці доказу актывісты HRW прадставілі нават заключэнне адмысловай культуралагічнай экспертызы, якая паставіла ў віну стваральнікам кінастужкі, што «ў якасці галоўных адмоўных персанажаў і процістаўлення іх станоўчым гетэрасэксуальным героям задзейнічаны дзве асобы аднаго полу, якія належаць да адной сацыяльнай групы і адчуваюць узаемную сімпатыю». А некалькі пакаленняў савецкіх і постсавецкіх людзей, бач ты, жылі і не ведалі...

Дарэчы, Аліса Селязнёва стала далёка не першай ахвярай абаронцаў тонкай душэўнай арганізацыі сэксуальных меншасцяў Нідэрландаў. Трохі раней у спіс забароненых фільмаў трапіў, напрыклад, савецкі ж фільм «Цімур і яго каманда» — за «агрэсіўную прапаганду гетэрасэксуальных стасункаў сярод падлеткаў і ўшчамленне правоў гомасэксуалістаў праз дэманстрацыю грамадству іх рэпрадуктыўнай непаўнацэннасці», ні больш ні менш.

Ха! Гэтыя актывісты, відаць, яшчэ савецкі фільм-казку «Пітэр Пэн» не бачылі. А ўжо калі паказаць ім хоць якую-небудзь экранізацыю класічнай гісторыі Рамеа і Джульеты — ой, што будзе, што будзе... Баюся, будзе зноў не смешна.

# ВОСЬ І КАЗАЧЦЫ КАНЕЦ

**Чарговая казка пра сучасную Папялушку ператварылася... не, не ў гарбуз, але ў сумна распаўсюджаную гісторыю «развод і дзявочае прозвішча». Не дажыўшы ўсяго нічога да 10-годдзя сям'і, спявачка Анжаліка Агурбаш (Ліка Ялінская) і «каўбасны кароль» Мікалай Агурбаш падалі на развод.**

Папярэднія слуханні адбыліся ў Маскве ўжо ў чэрвені, але пары па традыцыі было дадзена 2 месяцы на прымірэнне і вылучэнне іскавых патрабаванняў. Сярод апошніх з боку мужа — забраць у Анжалікі не толькі агульнага сына Анастаса, але і прозвішча Агурбаш, бо яно зарэгістравана ў якасці гандлёвай маркі. Спявачка ж, натуральна, жадае, каб малодшы сын жыў з ёй. Дый наконт прозвішча можна паспрачацца: з аднаго боку, Мікалай «падмацаваў» яго грашовай падтрымкай, а з другога — менавіта Анжаліка зрабіла «сваім» у свецкай тусоўцы.

Тым не менш у судовым іску ўжо амаль былыя муж і жонка адзначылі, што спрэчак наконт падзелу сумесна нажытай маёмасці і месцы пражывання агульнага непаўналетняга дзіцяці паміж імі няма. Масла ў агонь паквольных інтэрнэт-плётак дадае той факт, што ні ўладальнік мяснной кампаніі, ні сама спявачка практычна не каментуюць падзеі, даючы зразумець занадта цікаўным, што ўсё ўжо вырашана і ідзе паводле плана.

Тут была б дарэчы сентэнцыя кшталту «Нашто, дзяўчаты, вы багатых любіце?», але мы абыдземся без яе. У рэшце рэшт, у кожнай сям'і свая гісторыя.

# ЦЭНЗУР@ З НАЦЫЯНАЛЬНЫМІ АСАБЛІВАСЦЯМІ

**У сецiве з'явіцца «чорны спіс» забароненых сайтаў. Дэпутаты Дзярждумы РФ задумалі стварыць рээстр рэсурсаў, якія прадпісана будзе выдаліць з інтэрнэту, — рускамоўныя сайты з дзіцячай парнаграфіяй, рэкламай наркотыкаў і інструкцыямі па суіцыдзе. Ідэя высакародная — калі не ўзгадваць, куды часта прыводзяць падобныя ідэі, і не звяртаць увагі, як канкрэтна яе прапануецца рэалізаваць.**

Справа ў тым, што са студзеня 2013 года адмыслова створаны пры ўрадзе камітэт будзе самастойна, без прыцягнення судовых і іншых інстанцый, вызначаць ступень шкоднасці інтэрнэт-рэсурсаў. Інфармацыя аб занясенні сайта ў «чорны спіс» цягам сутак будзе перададзена хостынг-правайдару. Той, у сваю чаргу, павінен папярэдзіць уладальніка старонкі, што ў таго ёсць яшчэ суткі, каб выдаліць пэўную інфармацыю, інакш сайт будзе закрыты. Абскардзіць падобнае рашэнне можна будзе толькі праз суд.

Інтэрнэт-суполка адрэагавала на навіну рэзка, расцаніўшы законапраект як увядзенне жорсткай цэнзуры. Сапраўды, што і хто ўстрымае «правяральнікаў» ад спакусы закрыць тую ці іншую старонку па палітычных альбо асабістых матывах ці запрасіць з уладальнікаў «шкодных» сайтаў кругленькія сумы?

У знак пратэсту супраць вышэйназванай заканадаўчай ініцыятывы найбуйнейшая інтэрнэт-энцыклапедыя Wikipedia на суткі спыніла сваю працу. Дарэчы, на пачатку гэтага года ў выніку аналагічнай «забастоўкі» кангрэс ЗША адклаў на няпэўны тэрмін разгляд закона аб барацьбе з пірацтвам у інтэрнэце. Але ж тое ЗША, а ў Расіі цяпер варта сачыць не толькі за кожным сваім словам, выпушчаным у сеціва, але і за кожным крокам, клікам і «лайкам»...

# НЕ БРЫВОМ АДЗІНЫМ




**Форвард баскетбольнай каманды «Нью-Арлеан» Энтані Дэвіс, акрамя таго, што паказвае прыхільнікам добрую гульню, валодае адметнай вонкавай рысай — яго бровы зрасліся ў так званае монабрыва. Менавіта гэта якасць натхніла маладога чалавека на дзіўны крок: ён задумаў зарэгістраваць гандлёвыя маркі Fear The Brow («бойся брыва») і Raise The Brow («уздымаць бровы»).**

«Не хачу, каб хто-небудзь вырошчваў сабе монабрыво з-за мяне, а потым спрабаваў зарабіць на гэтым. Мая сям'я вырашыла зарэгістраваць гандлёвыя маркі, таму што гэта сапраўды ўнікальна», — даслоўна заявіў Дэвіс у інтэрв'ю мясцовай прэсе.

Самае дзіўнае не ў тым, што баскетбаліст лічыць сябе такім ужо непаўторным: наўрад ці ён праходзіў у школе, што падобная генетычная адметнасць была вядомая яшчэ ў часы Старажытнага Рыма, дзе, між іншым, зрослыя бровы лічыліся вельмі сэксуальнымі. І нават не ў жаданні абагаціцца на ўласнай знешнасці — гэта таксама распаўсюджаная чалавечая праява. Забаўна тое, што са сваёй ідэяй Дэвіс спазніўся: на тэрыторыі ЗША ўжо ёсць такія гандлёвыя маркі, якія належаць уладальніку крамы ў Кентукі. Так што баскетбалісту, каб вылучыцца і зарабіць, застаецца вышчыпаць бровы і вырасціць што-небудзь іншае. Спартыўнае майстэрства, напрыклад.

**Дзяжурыла па сеціве Вікторыя ЗАХАРАВА.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

19 07 2012 г.

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,**

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 25 июля 2012 года**
***в соответствии с приказом Председателя Правления ОАО «АСБ Беларусбанк»***
**ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. О переводе (изменении категории) простых (обыкновенных) акций ОАО «АСБ Беларусбанк», принадлежащих акционерам – физическим лицам, в привилегированные акции второго типа.
2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».
3. О размере вознаграждения членам Наблюдательного совета ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 20 июля), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 25 июля) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 709(в).

Дата окончания приема бюллетеней – 20 июля 2012 года.

Телефоны для справок: (8-017) 218 88 37, 218 84 38.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912

---

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

**www.belgazprombank.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2012 г.
ОАО «Белгазпромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 399 778,2 | 170 126,3 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 3 717,2 | 20 097,1 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 585 785,6 | 878 440,4 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 594 968,7 | 625 746,0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 065 668,6 | 519 344,1 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 4 148 228,6 | 2 532 083,3 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 646 177,8 | 239 557,1 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 45,8 | 45,9 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 220 771,1 | 86 544,3 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 686,1 | 1 897,5 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | | 95 520,1 | 66 444,9 |
| **13** | **Итого активы** | **11** | | **9 761 347,8** | **5 140 326,9** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | 316 153,9 | 316 114,9 |
| 16 | Средства банков | 1202 | | 1 679 111,7 | 1 435 796,8 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | | 5 439 682,2 | 2 363 672,8 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 404 296,9 | 339 121,5 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | | 900 524,2 | 38 386,1 |
| 21 | Всего обязательства | 120 | | 8 739 768,9 | 4 493 092,1 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 426 268,8 | 426 268,8 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 77 626,8 | 27 564,5 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 109 081,7 | 22 132,5 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 408 601,6 | 171 269,0 |
| 28 | Всего капитал | 121 | | 1 021 578,9 | 647 234,8 |
| **29** | **Итого обязательства и капитал** | **12** | | **9 761 347,8** | **5 140 326,9** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2012 г.
ОАО «Белгазпромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 616 325,1 | 198 475,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 376 485,4 | 93 959,4 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | | 239 839,7 | 104 515,8 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 100 970,6 | 57 402,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 32 631,9 | 32 217,0 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | | 68 338,7 | 25 185,0 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 27 670,6 | (27 111,7) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 35 525,9 | (9 919,4) |
